Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

8 СНЕЖНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 241 (29863)

САКРЭТЫ ВЫХАВАННЯ АД ТАТЫ-АДЗІНОЧКІ

Сямейная вязь

ЗНАЙСЦІ ЎПРАВУ НА ДЭБАШЫРА

Сямейная вязь

ЛІЧБА ДНЯ

7 797,7 млн долараў

у эквіваленце, паводле папярэдніх звестак, склалі міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 снежня 2022 года, паведаміла ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка. За лістапад золатавалютныя рэзервы выраслі на $ 207,9 млн (2,7 %) пасля павелічэння ў кастрычніку на $86,5 млн (на 1,1 %). У студзені—лістападзе 2022 года фізічныя асобы прадалі на $ 135,9 млн замежнай валюты больш, чым купілі. Агульны аб'ём набытай фізічнымі асобамі наяўнай і безнаяўнай замежнай валюты ў студзені—лістападзе склаў $ 9,032 млрд, прададзенай — $ 9,168 млрд. Суб'екты гаспадарання — рэзідэнты Беларусі ў студзені—лістападзе выступалі ў ролі чыстых пакупнікоў замежнай валюты. Зыходзячы з даных Нацыянальнага банка, прадпрыемствы купілі на $ 926,6 млн валюты ў эквіваленце больш, чым прадалі. Агульны аб'ём набытай юрыдычнымі асобамі замежнай валюты ў студзені—лістападзе склаў $ 24,719 млрд, прададзенай — $ 23,792 млрд.

КАРАТКА

- **Гідраметэаслужбы Беларусі і Расіі распрацуюць новыя тэхналогіі прагназавання надвор'я.**
- Нацбанк выпусціць у абарачэнне памятную манету да года Труса.
- **Колькасць заявак на конкурс «Пазнай Беларусь» сёлета перавысіла 840.**

ISSN 1990 — 763X

Папярова-святочны настрой

Фота БелТА.

У Крычаўскай дзіцячай школе мастацтваў навучэнцы могуць спасцігнуць усе сакрэты выцінанкі. Надзвычай папулярнаму ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя майстэрству іх навучае **член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Наталля БЯРНАДСКАЯ.** Перад Новым годам яна са сваімі выхаванцамі выразае з паперы ёлкі, сняжынкі, іншыя святочныя ўпрыгажэнні. Як калісьці прабабулі...

Кібербяспека

НЕ ПАДКЛЮЧАЙЦЕ WI-FI У КАВЯРНІ!

Пра абарону асабістых звестак, наступствы іх уцечкі і чалавечую бестурботнасць

Сучаснае натуральнае асяроддзе чалавека змянілася з прыроднага на тэхналагічнае. 80 % беларусаў карыстаюцца інтэрнэтам. У абароце знаходзіцца каля 15 мільёнаў банкаўскіх картак, каля 120 тысяч ID-картак і 102 тысячы біяметрычных пашпартоў. Аднак карысныя і зручныя тэхналогіі маюць і адваротны бок у выглядзе магчымасці махлярства. Што робіцца ў краіне для абароны персанальных даных (ПД) ад уцечкі і злоўжывання і якія звесткі пра сябе не трэба даваць усяму свету, нават калі вельмі хочацца, расказалі спецыялісты.

Рэкамендацыі для юрыдычных асоб і грамадзян

Тэхнічнае развіццё чалавецтва нясе прынцыпова новыя магчымасці, аднак спараджае прынцыпова новыя рызыкі, і паміж гэтымі дзвюма катэгорыямі трэба знайсці аптымальны баланс. Многія праблемы ўзнікаюць з-за нядбайнасці саміх людзей, якія бестурботна абыходзяцца са сваімі асабістымі звесткамі і, жадаючы атрымліваць перавагі ад выкарыстання сучасных тэхналогій, не суадносяць іх з рызыкамі, якія стаяць за кожным зручным гаджэтам, упэўнены **Сяргей ЗАДЗІРАН, намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных:**

— Цэнтрам рыхтуецца пакет сацыяльнай рэкламы, якая раскажа людзям пра існуючыя рызыкі, а сумесна з Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі праводзіцца апытанне, каб атрымаць ад беларусаў зваротную сувязь адносна таго, ці ведаюць яны пра новыя падыходы ў абароне ПД, ці разумеюць, якімі правамі валодаюць.

СТАР. 3

Вандроўка патрыёта

У госці да Дзеда Бая

Чаму расце цікавасць да экалагічнага турызму?

Фота носіць інфармацыйны характар.

Асаблівы інтарэс да экалагічнага турызму — наведванне амаль некранутых чалавекам куткоў прыроды — з'явіўся падчас пандэміі. Многія краіны абмежавалі ўезд турыстаў, і беларусы пачалі шукаць штосьці новае і цікавае на радзіме. Не ўсе аб'екты экалагічнага турызму былі падрыхтаваны да наплыву гасцей, аднак цяпер спецыялісты ўпэўнена кажуць, што ім ёсць дзе прыняць турыстаў, і гатовы паказаць самыя запаветныя мясціны беларускай прыроды.

Больш за 90 комплексаў, дзясяткі экалагічных сцежак і маршрутаў

Візітоўкай Беларусі нараўне з яе азёрамі з'яўляюцца і лясы. На базе паляўнічых гаспадарак маецца амаль сотня абсталяваных для турыстаў комплексаў.

— Па сістэме Мінлясгаса на базе лесапаляўнічых гаспадарак мы сёння маем больш як 90 камфартабельных і добра абсталяваных комплексаў. Спачатку яны планаваліся пад прыём паляўнічых, але цяпер у большай ступені запатрабаваны ўжо экалагічнымі турыстамі.

СТАР. 13

Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

РАБОЧЫ ВІЗІТ У БІШКЕК

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8-9 снежня здзейсніць рабочы візіт у Кыргызстан. У Бішкеку кіраўнік беларускай дзяржавы прыме ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Парадак дня саміту ЕАЭС — каля двух дзясяткаў пунктаў. Кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць развіццё кааперацыйных праектаў у прамысловасці, фарміраванне агульных рынкаў, работу па ўхіленні перашкод і бар'ераў ва ўзаемным гандлі, асноўныя напрамкі міжнароднай дзейнасці на 2023 год і іншыя пытанні.

Чакаецца, што ў час пасяджэння Аляксандр Лукашэнка агучыць прапановы беларускага боку па стратэгічных напрамках развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза, якія датычацца далейшага паглыблення інтэграцыі на прасторы ЕАЭС і забеспячэння ўстойлівасці нацыянальных эканомік.

Наталля КАЧАНАВА:

«МЫ МОЖАМ ЗРАБІЦЬ УСЁ САМІ, ГЭТА ПАКАЗВАЕ І ЖЫЦЦЁ»

У Савеце Рэспублікі прайшла нарада па пытанні функцыянавання ААТ «МотаВелаЗавод»

Наталля Качанава правяла нараду па пытанні функцыянавання ААТ «МотаВелаЗавод». Як падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі, галоўнай тэмай сустрэчы стала лакалізацыя айчыннай тэхнікі:

— Мы праводзім чарговую рабочую сустрэчу па пытаннях выканання даручэнняў кіраўніка нашай дзяржавы, якія былі дадзены падчас наведвання «МотаВелаЗавода». 9 лістапада мы зноў сустрэліся на прадпрыемстве, абмеркавалі тыя пытанні, якія ўжо вырашаны і што яшчэ неабходна зрабіць, каб выканаць даручэнні Прэзідэнта, — адзначыла Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі скіравала ўвагу на тое, што да новага года прадпрыемства павінна прадставіць кірункі, па якім будзе рухацца:

— Мы павінны паказаць, што будзе выпускаць «МотаВелаЗавод», у тым ліку ў частцы лакалізацыі прадукцыі: што выпускалі раней і што новага з'явіцца ў асартыменце прадпрыемства. Калі мы размаўлялі 9 лістапада, я зразумела, што пытанні лакалізацыі ў нас да канца не вырашаны або прапрацаваны недастаткова. Альбо ёсць нейкія перашкоды ў поўнай меры выпускаць камплектуючыя для матацыклаў і веласіпедаў на прадпрыемствах нашай краіны.

Наталля Качанава падкрэсліла, што неабходна прапісаць, які працэнт прадукцыі быў дасягнуты і што прадпрыемства мяркуе зрабіць, каб выпускаць больш сучасны асартымент:

— Прэзідэнт неаднаразова гаварыў аб тым, што мы можам зрабіць усё самі, гэта паказвае і жыццё. Напрыклад, у сістэме аховы здароўя — выпускаць сродкі для абеззаражвання. Усё гэта мы можам зрабіць самі. Але прадпрыемствам, якія працуюць у нашай краіне, трэба больш актыўна ўключацца, — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Па выніках нарады генеральны дырэктар ААТ «МотаВелаЗавод» Сяргей Манько адзначыў, што падчас сустрэчы былі абмеркаваны пытанні лакалізацыі айчыннай тэхнікі і імпартных камплектуючых:

— Да канца першага квартала 2023 года пастаўлена мэта лакалізаваць 26 % айчыннага матацыкла «Мінск». Да канца 2023 года матацыкл «Мінск» будзе лакалізаваны да 36 %, але на гэтым наша вытворчасць не спыняецца — мы будзем праводзіць работу па лакалізацыі і мадэрнізацыі.

Арына КАРПОВІЧ.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю СІМІРСКАГА Валянціна Раманавіча, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Парламенцкі дзённік

ЗБАЛАНСАВАНАСЦЬ БЮДЖЭТУ І САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА НАСЕЛЬНІЦТВА

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні прынялі асноўны фінансавы дакумент краіны

Аднак не толькі на законапраекце «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2023 год» была засяроджана ўвага парламентарыяў. На заканадаўчым узроўні зацверджана павелічэнне працоўных пенсій, гарантавана выплата ўсіх відаў пенсій і дапамог. Куды будуць накіраваны бюджэтныя сродкі і якім чынам павысіцца дабрабыт беларускага народа, расказалі прадстаўнікі дэпутацкага корпуса і іншых дзяржаўных органаў. Удасканаленне заканадаўства чакаецца таксама ў пытаннях супрацьдзеяння карупцыі, абароны правоў працоўных мігрантаў і прафілактыкі злачыннасці.

Фота БелТА.

У прыярытэце — сацыяльная скіраванасць

Адразу ў двух чытаннях дэпутаты прынялі праект Закона «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2023 год». Законапраектам вызначаны крыніцы фарміравання даходаў бюджэту фонду, іх аб'ём і кірункі выкарыстання сродкаў, устанаўліваецца парадак выканання бюджэту фонду. Даходы бюджэту фонду разлічаны ў суме 25 221,6 мільёна рублёў, або 116 % да бюджэту фонду за 2022 год, расходы — у суме 24 685,1 мільёна рублёў, або 116 % да бюджэту фонду за мінулы год.

Як адзначыла **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ,** сярэднямесячны памер пенсіі па ўзросце для непрацуючага пенсіянера складзе 692 беларускія рублі. «Адпаведна павялічыць пенсіі ў наступным годзе плануецца на 15 %», — звярнула яна ўвагу. Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Юліі МУРЫНАЙ,** бюджэт фонду на 2023 год сфарміраваны з перавышэннем даходаў над расходамі за кошт сродкаў прафесійнага пенсіённага страхавання ў суме 536,5 мільёна беларускіх рублёў. «Гэта дасць магчымасць гарантаваць выплаты ўсіх відаў пенсій і дапамог у запланаваных аб'ёмах», — падкрэсліла дэпутат.

У першым чытанні дэпутацкім корпусам разгледжаны праект Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2023 год». Ключавой задачай развіцця Беларусі ў наступным годзе, згодна з дакументам, будзе з'яўляцца забеспячэнне збалансаванасці і ўстойлівасці рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама сацыяльная абароненасць насельніцтва і павышэнне на гэтай аснове дабрабыту беларусаў.

Даходы па праекце рэспубліканскага бюджэту на наступны год прадугледжваюцца ў суме 33 362,4 мільёна рублёў і, у параўнанні з ацэнкай паступленняў бягучага года, павялічацца на 24,6 %. Расходы сфарміраваны ў суме 36 536,2 мільёна рублёў, або 109,9 % да чаканага выканання 2022 года.

Як падкрэсліла **член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Святлана АДЗІНЦОВА,** рэспубліканскі бюджэт на 2023 год захоўвае сацыяльную накіраванасць. «На сацыяльную сферу выдаткаваны 117 % да ацэнкі 2022 года, у тым ліку на ахову здароўя — 116 %, на адукацыю — 119 %, на фізічную культуру, спорт, культуру, СМІ — 118 %, сацыяльную палітыку — 116 %, — удакладніла парламентарый. — У сістэме аховы здароўя захоўваецца фінансаванне на аднаго жыхара ў памеры 1118 беларускіх рублёў. 40 % ад агульнага фінансавання пойдзе на аказанне медыцынскай дапамогі ў амбулаторных умовах, у тым ліку на хуткую медыцынскую дапамогу. З рэспубліканскага бюджэту будуць выдзелены сродкі для цэнтралізаванага набыцця аўтамабіляў хуткай дапамогі, школьных аўтобусаў, аўтамабіляў для сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва».

Падаткі — па новых правілах

У першым чытанні адобраны законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях падаткаабкладання». Дакументам прадугледжаны сістэмныя меры па ўдасканаленні падатковага заканадаўства і дасягнення аптымальнага ўзроўню падатковай нагрузкі на эканоміку, не дапускаючы пры гэтым зніжэння аб'ёму бюджэтных даходаў. У прыватнасці, з 2023 года законапраектам прапаноўваецца адмяніць малаэфектыўныя падатковыя льготы, індэксаваць стаўкі зямельнага, экалагічнага падатку, падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах з мэтай адаптацыі іх да працэсаў інфляцыі. Акрамя таго, павялічацца стаўкі падатку на прыбытак для юрыдычных асоб з 18 да 20 % і з 16 да 20 % — падаходнага падатку з даходаў індывідуальных прадпрымальнікаў. Чакаюцца і іншыя новаўвядзенні.

— У ходзе падрыхтоўкі змяненняў законаў па пытаннях падаткаабкладання была праведзена сур'ёзная работа па аналізе існуючых падаткавых ставак, ільгот, якія дзейнічаюць у нас у краіне, — расказаў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Пётр ВАБІШЧЭВІЧ.** — У выніку аналізу частку льгот, якія неэфектыўна выкарыстоўваюцца, вырашана адмяніць. Улічваючы вопыт пандэмійнага перыяду, для аператараў сотавай рухомай электрасувязі, камерцыйных мікрафінансавых арганізацый, Парка высокіх тэхналогій захавана стаўка падатку на прыбытак у памеры 30 %. Захавана і права мясцовых Саветаў дэпутатаў уводзіць мясцовы збор за перасячэнне транспартнымі сродкамі граніцы.

Антыкарупцыйныя абмежаванні

Законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях барацьбы з карупцыяй», прыняты ў другім чытанні, у прыватнасці, накіраваны на павышэнне эфектыўнасці супрацьдзеяння карупцыі, аптымізацыю ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў і іншых арганізацый у сферы прафілактыкі карупцыі.

Як паведаміла **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ,** законапраектам прадугледжваецца ўстанаўленне антыкарупцыйных абмежаванняў для ўсіх блізкіх сваякоў або родзічаў дзяржаўнай службовай асобы. «Устанаўліваецца забарона сумеснай работы мужа і жонкі, блізкіх сваякоў або родзічаў на пэўных пасадах не толькі ў дзяржарганізацыях, але і ў арганізацыях з пераважнай доляй уласнасці дзяржавы, а таксама на выкарыстанне дзяржаўнай службовай асобай у пазаслужбовых інтарэсах любой маёмасці дзяржоргана або арганізацыі, а не толькі атрыманай ім пры выкананні службовых абавязкаў, — удакладніла дэпутат. — Устанаўліваюцца агульныя падставы адказнасці юрыдычнай асобы за ўчыненне карупцыйных дзеянняў ад яе імя або ў яе інтарэсах. Заканадаўча замацоўваюцца абавязкі для кіраўнікоў дзяржорганаў і іншых арганізацый па прадухіленні і выяўленні парушэнняў заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй, ліквідацыі наступстваў парушэнняў, прычын і ўмоў, якія ім садзейнічаюць».

За здраду дзяржаве — выключная мера

Таксама дэпутаты прынялі ў першым чытанні законапраект «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці». Праектам закона прапануецца ўнясенне змянення ў санкцыю часткі 2 артыкула 356 Крымінальнага кодэкса, якія прадугледжваюць магчымасць выключнай меры ў выглядзе смяротнага пакарання за здраду дзяржаве, учыненую службовай асобай, якая займае дзяржаўную пасаду, або асобай, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага. Прыводзяцца ў адпаведнасць таксама артыкулы 58 і 59 КК.

Артыкул 360 КК дапаўняецца заўвагай, якая дапускае вызваленне асобы ад крымінальнай адказнасці за падрыхтоўчыя дзеянні да дыверсіі ў выпадку яе прадухілення.

Таксама ў КК уносіцца дадатак у мэтах устанаўлення адказнасці за распаўсюджванне заведама лжывых звестак, якія дыскрэдытуюць Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні, ваенізаваныя арганізацыі Беларусі.

Акрамя таго, прапануецца ўстанавіць памер штрафу за антыдзяржаўныя злачынствы ў межах ад 500 да 50 тысяч базавых велічынь.

Праектам закона Крымінальны кодэкс дапаўняецца артыкулам 289-1 «Прапаганда тэрарызму». Таксама прапануецца дапоўніць КК артыкулам 375-2 «Парушэнне патрабаванняў па абароне дзяржаўных сакрэтаў».

Змяненні ў частку 4 артыкула 108 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, якія прапануюцца праектам закона, прадугледжваюць магчымасць затрымліваць асоб па артыкулах 356-358-1 КК на тэрмін да 10 сутак, а абвінавачанне прад'яўляць у тэрмін да 20 сутак з моманту затрымання. Гэта выклікана тым, што часта па такіх саставах злачынстваў, акрамя працэсуальнага замацавання доказаў на пачатковай стадыі, актыўна праводзяцца аператыўна-следчыя камбінацыі, на правядзенне якіх 72 гадзін затрымання бывае недастаткова.

Паводле БелТА.

НЕ ПАДКЛЮЧАЙЦЕ WI-FI У КАВЯРНІ!

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Варта карыстацца і рэкамендацыямі, якія падрыхтаваны нашым цэнтрам. Яны даступныя на сайце cpd.by у раздзеле «Прававая аснова» ў папцы «Метадалагічныя дакументы, рэкамендацыі». Тут змешчаны і алгарытм правядзення дзейнасці аператараў, і прыклады рэестраў апрацоўкі ПД, і рэкамендацыі па складанні дакумента, які вызначае палітыку ўпаўнаважанай асобы ў дачыненні да апрацоўкі персанальных даных, і рэкамендацыі па апрацоўцы ПД у сувязі з працоўнай і службовай дзейнасцю.

Метадалагічная работа цэнтра скіравана не толькі на арганізацыі, але і на грамадзян. У спецыяльнай рубрыцы на сайце падрабязна расказваецца пра правы людзей: як абараніць сябе падчас апрацоўкі персанальных даных, якія заявы можна падаваць аператарам і ўпаўнаважаным асобам і што трэба ў іх указваць, дадала **Ірына ПЫРКО, намеснік начальніка ўпраўлення метадалогіі абароны персанальных даных Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных:**

— Літаральна днямі на сайце з'явіліся новыя рэкамендацыі — аб узаемадзеянні аператараў і ўпаўнаважаных асоб пры апрацоўцы ПД. Задача дакумента — вызначыць статус арганізацыі, якая займаецца апрацоўкай ПД. Гэта важна, таму што ў залежнасці ад таго, з'яўляецца арганізацыя аператарам ці ўпаўнаважанай асобай, вызначаецца яе прававое становішча. Аператары вызначаюць ключавыя параметры апрацоўкі, тобок менавіта яны арганізуюць апрацоўку ПД і нясуць адказнасць за парушэнне правоў суб'ектаў гэтых звестак. А ўпаўнаважаная асоба мае адказнасць перад аператарам, але не мае яе перад суб'ектамі ПД.

Адзіная лічбавая платформа МУС

Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) — адзін з найбуйнейшых трымальнікаў персанальных даных (ПД) у Беларусі (асноўны рэсурс — рэгістр насельніцтва, дзе знаходзіцца звыш 11 мільёнаў запісаў). Для абароны асабістых звестак у міністэрстве выкарыстоўваецца шматузроўневая мадэль, расказаў **Юрый КІРЭЕЎ, намеснік начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС:**

— Для аптымізацыі выкарыстання рэсурсаў у МУС створана інфармацыйная інфраструктура — Адзіная лічбавая платформа (АЛП) МУС, якая ўключае ў сябе тэхнічныя, праграмныя і праграмна-апаратныя сродкі апрацоўкі, каналы для перадачы даных і інфармацыйнага абмену, сродкі тэхнічнай і крыптаграфічнай абароны.

Спецыяліст запэўніў, што сістэма закліканая абараняць актывы ад выпадковага або наўмыснага ўздзеяння на інфармацыю, яе носьбіты і працэсы апрацоўкі ды перадачы; забяспечваць канфідэнцыяльнасць, цэласнасць, сапраўднасць, даступнасць і абаронепасць інфармацыі. З дапамогай АЛП фарміруюцца і рэгламентуюцца адзіныя падыходы і патрабаванні да забеспячэння інфармацыйнай бяспекі супрацоўнікамі, дзяржорганамі і юрыдычнымі асобамі ў межах узаемадзеяння з МУС; пры апрацоўцы, захоўванні і перадачы па тэхнічных каналах інфармацыя абараняецца ад уцечкі, а супрацоўнікі інфармуюцца аб магчымых фактарах рызыкі інфармацыйнай бяспекі і мерах супрацьдзеяння ім.

Акрамя таго, для інфармацыйнай бяспекі прадугледжана своечасовае выяўленне і ацэнка крыніц пагроз і іх характар, прагназаванне развіцця з'яў на аснове маніторынгу інцыдэнтаў інфармацыйнай бяспекі, аборона ад умяшальніцтва ў функцыянаванне АЛП староннік асоб, а таксама абарона захоўваемых у інфармацыйных сістэмах МУС звестак ад мадыфікацыі праз укараненне несанкцыянаваных праграм.

Самі вінаватыя ў распаўсюджванні...

Аператар інфармацыйнай сістэмы, які апрацоўвае асабістыя даныя, павінен стварыць комплекс умоў для забеспячэння поўнай абароны іх ад уцечкі. Дзяржава прымае на сябе функцыі ў дадзенай галіне — пра тое, што ПД павінны абараняцца на ўзроўні дзяржавы, сказана ў Законе «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі», нагадаў **Аляксандр ГОРБАЧ, дырэктар Навуковадаследчага інстытута тэхнічнай абароны інфармацыі:**

— Рэгулятарам у галіне абароны інфармацыі вызначаны Аператыўна-аналітычны цэнтр (ААЦ), які абазначыў меры аб ахове ПД. У прыватнасці, усе суб'екты гаспадарання, якія сутыкаюцца з апрацоўкай персанальных даных, павінны правесці работы па стварэнні і атэстацыі сістэмы абароны інфармацыі. Якім чынам — вызначана ў нарматыўна-прававых актах ААЦ.

У краіне існуюць таксама нацыянальныя сродкі абароны інфармацыі айчыннай распрацоўкі і вырабу. Гэта, напрыклад, цэлая серыя крыптаграфічных сродкаў: электронны лічбавы подпіс для сведчання электроннага дакумента; сродкі, якія дазваляюць шыфраваць інфармацыю для яе захоўвання ці падачы; сродкі крыптаграфічнай абароны канальнага шыфравання. А таксама сканеры, якія дазваляюць вызначаць уразлівасць аперацыйных і інфармацыйных сістэм, і комплекс апаратных сродкаў, што абараняюць інфармацыю ад несанкцыянаванага доступу і ўцечкі.

Цэнтр фіксуе ўцечкі персанальных звестак штотыднёва, у асноўным гэта сфера рытэйлу.

— Наступствы ўцечкі ПД могуць быць самыя розныя. Авалодаўшы пашпартнымі данымі, напрыклад, можна аформіць на іх уладальніка крэдыт, зарэгістраваць бізнес, распарадзіцца маёмасцю, нават пачаць шантажыраваць чалавека ці яго блізкіх. Падмененую такім чынам асобу можна выкарыстаць і для нейкіх махлярскіх дзеянняў, — перасцярог Сяргей Задзіран. *— Зламыснікам нават не трэба асабліва напружвацца, каб знаходзіць асабістыя звесткі, якія распаўсюджвае пра сябе сам чалавек. Напрыклад, рэгіструецца ў сацсетцы пад сапраўдным імем, выкладвае на старонцы фота дакумента (тое ж пасведчанне кіроўцы), каб паказаць свае дасягненні, або здымак аўто з нумарным знакам. Вось вам і гатовая сабраная інфармацыя для тэлефонных махлярскіх званкоў. А па адзначанай геалакацыі можна без праблем знайсці тэлефон яго ўладальніка.*

Ірына СІДАРОК.

Парады ад спецыялістаў

• Паролі да розных рэсурсаў у чалавека павінны быць разнастайнымі і складанымі. На справе ж яны, як правіла, не вызначаюцца складанасцю і вялікімі адрозненнямі. Авалодаўшы доступам да аднаго з іх, можна падабраць паролі і да іншых сістэм, якімі карыстаецца чалавек.

• Працуючы ў інтэрнэце, трэба карыстацца праверанымі браўзерамі і сачыць, па якіх спасылках пераходзіш.

• Пампуючы дадатак на мабільны тэлефон, варта папярэдне праверыць яго рэйтынг і водгукі карыстальнікаў.

• Падключэнне да бясплатнага Wi-Fi (у кафэ, транспарце, гандлёвым цэнтры) з указаннем лагіна і пароля павінна стаць табу, бо гэта можа быць небяспечным.

• Чытаць палітыку апрацоўкі ПД у сацыяльных сетках, каб разумець, што будзе адбывацца з вашымі асабістымі звесткамі.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Германіі прайшлі маштабныя рэйды ў сувязі з падазрэннем аб падрыхтоўцы дзяржпераваротаў

У ФРГ прайшлі маштабныя рэйды супраць ультраправых экстрэмістаў руху «Грамадзяне рэйха» («Рэйхсбюргеры»), падчас якіх затрымалі 25 чалавек. Членаў гэтага руху падазраюць у падрыхтоўцы дзяржпераваротаў, паведаміла Associated Press. Паводле даных агенцтва, затрыманні адбыліся ў рамках серыі рэйдаў у 11 з 16 федэральных земляў Германіі. У іх узяло ўдзел каля трох тысяч супрацоўнікаў паліцыі. Нямецкая газета Die Zeit адзначае, што цяперашняя аперацыя па затрыманні экстрэмістаў з'яўляецца адной з найбуйнейшых у краіне. Больш за тое, паліцыя мае справу з шырока разгалінаванай злачыннай структурай, якая ўключае ў сябе розныя падгрупы. Паводле версіі следства, экстрэмісты разглядалі магчымасць нападу на бундэстаг і захоп дэпутатаў у заложнікі. Расследаванне ўзначальвае генеральны пракурор Германіі. Падазраваным можа быць прад'яўлена абвінавачанне ў стварэнні тэрарыстычнай арганізацыі.

Пры сутыкненні двух цягнікоў у Каталоніі пацярпела звыш 150 чалавек

Як паведаміла El Pais, пасажырскі цягнік, які накіроўваўся ў Барселону, сутыкнуўся з іншым цягніком. Аварыя адбылася на станцыі Манкада-і-Рэшак, якая знаходзіцца за некалькі кіламетраў ад каталонскай сталіцы. Каля 155 чалавек атрымала лёгкія раненні. Большасць пацярпелых атрымала лёгкія раненні, пяцёра — траўмы сярэдняй цяжкасці, яны былі дастаўлены ў медыцынскія цэнтры. На месца неадкладна выехалі экстранныя службы. Медыкі аказвалі дапамогу людзям проста на станцыі, дзе адбылося надзвычайнае здарэнне. Пацярпелыя былі эвакуіраваны менш чым за паўгадзіны. У сувязі з маштабнай аварыяй рух па адной з трас Барселоны быў паралізаваны.

Па сутнасці

ЛЕКІ АД АБЫЯКАВАСЦІ

Хварэюць людзі, хварэе грамадства, хварэюць нават дзяржавы. На жаль, менавіта такі стан з'яўляецца момантам ісціны: чаго ты варты? Ковід, нібы люстэрка, паказаў стан кожнага з нас і ўсяго свету. Пандэмія з аднаго боку запатрабавала масак на тварах, але ж скінула маскі з чалавечых душ і з сапраўднага стану краін.

Калі пра нас, то, па-першае, аказалася, што новыя гаджэты, сукенкі з буцікоў, нават машыны з пахам пластыкавага салона і кватэры ў шыкоўных раёнах — не галоўнае. Па-другое, аказалася, што нібыта трэндавыя прафесіі не такія важкія, як урач альбо пекар. Без эйчара і евангеліста праграмавання абысціся можна. Без урача і пекара — нельга.

А яшчэ з пастамента сацыяльных зносін, нібы ідалы з кручы Дняпра, былі зрынутыя статусы ў «інстаграмах», колькасць лайкаў у сацыяльных сетках. Людзі засумавалі па звычайных цёплых зносінах за кубачкам гарбаты. А яшчэ мы зразумелі, наколькі падпадаем пад інстынкт натоўпавага інтэлекту. Як нас проста напалохаць і падмануць жудасным інфармацыйным меню.

Асабліва яскрава паказалі сябе дзяржавы, іх мадэлі развіцця і кіраўніцтва краін. Здаецца, аднаго дакумента спампавалі паводзіны ў пандэмію самыя нібыта самадастатковыя дзяржавы. А мы не заўважылі, што Беларусь аказалася сапраўды суверэннай у сваіх рашэннях. Людзі больш «хварэлі» ковіднай істэрыкай, што распаўсюджвалі мас-медыя і блогасфера. Самыя галоўныя і «крутыя» краіны свету забіліся ў вугал. Іх дактары нічога не маглі зрабіць, іх сістэма аховы здароўя задыхалася ад недахопу ўсяго жыццёва неабходнага, а іх нацыянальныя гвардыі замест дапамогі разганялі людзей па кватэрах.

І пакуль адна частка менеджменту таксама цягнулася «завірусіць» па пратаколах СААЗ, а другая частка грамадства істэрыла, самыя правільныя крокі прымаў наш Прэзідэнт. Падштурхоўваў — урад і прамыслоўцаў, унікаў — у метады барацьбы за жыццё. Паходамі па «чырвоных» зонах, паездкамі па працоўных каллектывах, нават гумарнымі выказваннямі намагаўся знізіць сацыяльную боязь. Выклікаў увесь агонь на сябе. Чым выклікаў зайздрасць і злосць за яго палітычную самастойнасць, абурэнне нашпігаванага фэйкамі грамадства.

А днямі Прэзідэнт ізноў гаварыў аб набалелым. Смела. Аб хваробе абыякавасці. У некаторых урачоў. Так, агульным фронтам выстаялі. Дзякуй. Героі. Але... Ёсць над чым працаваць. Сёння ў грамадстве вельмі актыўна абмяркоўваюць урачэбны дэфіцыт. Медыцынскія ВНУ не скарачалі, у прыватных цэнтрах — урачоў хапае. А вось у раённых паліклініках ці бальніцах — не ўсё добра. Дзяржава ніколі не адступала ад свайго шляху: урач і настаўнік — арыенцір. Гэтыя прафесіі — інтэлектуальная эліта краіны. Адукацыя і ахова здароўя — найважнейшыя сферы. Усе з імі так альбо інакш кантактуюць. З маленства і да старасці. Па стане гэтых сфер увогуле ацэньваюць работу улады.

Санкцыі, страта лагістычных шляхоў — знешнія прычыны — выпрабаванне для нашай адкрытай экспартна арыентаванай эканомікі. Чым лепшыя і даражэйшыя нашы камбайны, сыры і маленечкія чыпы, тым лепш выглядаюць нашы гарады і вёскі. Дарэчы, дзяржаўныя ўлады маглі б ківаць на неверагодныя выпрабаванні. Але не, гэта не пра беларускае кіраўніцтва.

Школы — адкрываюць, дзіцячыя садкі — будуюць, райбальніцы — паступова забяспечваюць высокатэхналагічным абсталяваннем. Але яшчэ больш усё залежыць ад спецыяліста. Ад таго ж урача. Ад яго стаўлення да простага чалавека. Ад урача залежыць і рэйтынг дзяржаўнай улады, а яшчэ нярэдка жыццё. Калі карупцыя гэта іржа дзяржавы, то абыякавасць — цвіль.

На чарговай нарадзе беларускі лідар нагадаў кіраўніцтву медыцынскай галіны, як ён быў вымушаны асабіста выратоўваць чалавека. Кволая жанчына згасла на вачах родных. І ў райбальніцы з гэтым пагадзіліся. Зараз дзяржаўныя медыя паведамілі грамадству аб станоўчай дынаміцы ў пацыенткі. А калі б яе рэанімацыяй не заняўся Прэзідэнт?

Дзяржава неймаверныя сродкі ўкладае ў ахову здароўя. Зразумела, лягчэй, як у «цывілізаваным» свеце, увесці страхоўку. Але ці будзе гэта па-людску? У нас жа краіна справядлівасці. А ці па справядлівасці карыстацца ўсімі сацыяльнымі данатамі дзяржавы за кошт грамадства, а пасля атрымання дыплома ехаць лячыць падаткаплацельшчыкаў іншых краін? На беларускіх хірургаў сапраўднае «паляванне» ў краінах Захаду. Розуму і кампетэнцый у сваіх суайчыннікаў не хапае, рэкруціруюць нашых.

Ізноў дзяржава робіць розныя крокі, шукае спосабы, як заахвоціць пакаленне ўрачоў-індывідуалістаў лячыць сваіх жа суайчыннікаў, землякоў, родзічаў. Не проста лячыць, а ўважліва і самаддана змагацца за здароўе і жыццё беларусаў. Заахвоціць дырэктыўна. Або стымуламі. Па-першае, жыллём. Дзейнай моладзі, асабліва ў рэгіёнах, — зялёнае святло. Годдругі — і ўжо загадчык аддзялення.

Думае Прэзідэнт, чухаюць патыліцы ўпраўленцы, як гэтага ўрача заахвоціць выконваць свае абавязкі, служыць прызванню, дапамагаць людзям... Нібыта толькі наверсе гэта і патрэбна. Гэта патрэбна кожнаму з нас і ўсяму грамадству ўвогуле. Тое, што лыжка дзёгцю псуе ўсю бочку мёду — вядома. Адзін дрэнны ўрач, абыякавы службовец, грубы міліцыянер абнуляе намаганні ўсёй дзяржавы. Асобны непрыгожы ўчынак кожнага перакрэслівае агульны вынік. Ці не час нам увесці ў абарот новы жыццёвы прынцып: беларусы шчыруюць для беларусаў. І «сэрца на далоні» стане айчынным стылем узаемаадносін. І гэта найлепшыя лекі ад абыякавасці. Не толькі ў медыцыне.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ЖОРСТКІЯ «КВЭСТЫ»

Што адбываецца ў Польшчы?

Больш за палову палякаў апасаюцца, што ўзімку ім не будзе чым ацяпляць свае кватэры. Такія дадзеныя ўключаны ў даклад аб беднасці за 2022 год. Агульнанацыянальнае даследаванне, якое правяла група Szlachetna Paczka, прадвяшчае палякам змрочныя перспектывы, адзначыў Eadaily.com. Падчас апытання высветлілася, што 95 працэнтаў жыхароў краіны адчулі рост цэн на прадукты харчавання за апошнія шэсць месяцаў, а 89 працэнтаў — павелічэнне выдаткаў на ўтрыманне кватэры ці дома. 64 працэнты рэспандэнтаў пачалі эканоміць на культуры — не ходзяць у тэатры, кіно і г. д., 58 працэнтаў менш спажывае электраэнергіі, вады і газу, а 45 працэнтаў — менш купляе прадуктаў харчавання. Ад такіх жорскіх «квэстаў» палякі проста ў адчаі, тым больш што дзейснай падтрымкі ад улад чакаць не выпадае. Што ж адбываецца ў Польшчы, чаго нашым суседзям чакаць надалей?

САМ САБЕ ШАХЦЁР

Амаль 2,5 мільёна чалавек у Польшчы жывуць у дамах, дзе цячэ дах, няма герметычных вокнаў і дзвярэй, а на сценах і столях «яўна прысутнічае вільгаць». Кожны дваццаты жыхар краіны жыве без доступу да ваннай і прыбіральні. Кожная пятая сям'я з хваробай або інваліднасцю не можа пакрыць усе неабходныя выдаткі на лекі. 1,6 мільёна палякаў, у тым ліку 333 тысячы дзяцей, летась жылі ў крайняй галечы. «Гэта больш чым меркаваная агульная колькасць бежанцаў, якія засталіся ў нашай краіне з пачатку ваенных дзеянняў ва Украіне», — адзначыў партал Onet.pl. «Гэта шмат. 2022-і стаў для многіх палякаў найцяжэйшым за многія гады. Увасобіўся найгоршы сцэнарый, — канстатуе Onet.pl. — Рэчы, якіх мы апасаліся больш за ўсё, сталі нашай паўсядзённай рэальнасцю».

Жыхары Польшчы пачалі паліць смецце для ацяплення дамоў. Аб гэтым паведаміў польскі вэб-партал Interia. З надыходам халадоў кампаніі, якія займаюцца вывазам адходаў, заўважылі рэзкае скарачэнне колькасці смецця.

Праблема з наяўнасцю вугалю прывяла да таго, што жыхары Польшчы прынялі рашэнне самастойна здабываць дадзеную сыравіну. Bloomberg паведаміў аб супрацьзаконнай здабычы на тэрыторыі Ніжняй Сілезіі пры дапамозе шахт-капанак. Выданне Gazeta ў сваю чаргу адзначыла, што хуткі заробак дапамагае палякам выжываць падчас крызісу.

На тэрыторыі Ніжняй Сілезіі паўсюль можна знайсці вугаль усяго на мятровай глыбіні. На рынку Польшчы ён у дэфіцыце, таму кошт цяпер даволі высокі. Людзі, якія пражываюць на гэтай тэрыторыі, ведаюць пра гэта і актыўна выкарыстоўваюць такую магчымасць.

Выданні распавядаюць пра мясцовага жыхара, які вырашыў не называць свайго імя, каб пазбегнуць пакарання за незаконныя дзеянні. Ён працуе таксістам, але на працягу апошніх месяцаў яго аўтамабіль выкарыстоўваецца не для перавозкі грамадзян, а для транспарціроўкі вугалю, які здабываецца ім асабіста. Суразмоўца адзначыў, што на працягу гадзіны ён можа здабыць прыблізна тону вугалю, якую без цяжкасцяў у Польшчы магчыма хутка прадаць за тысячу злотых (каля 215 еўра).

ВЯРТАННЕ Ў XIX СТАГОДДЗЕ

Разгортваецца маштабная экалагічная катастрофа. За апошнія месяцы на поўдні Польшчы былі высечаны сотні тысяч дрэваў. Журналісты Onet.pl праінспектавалі лясы ў перадгор'і Заходніх Бескідаў і проста прыйшлі ў шок. «У Падхалі, Спішы, Араве, у Пенінах, Горцы, Сондэчызне ці каля Бабінай Гуры ў кожным лесе чуваць маторныя пілы, а побач з дамамі ляжаць кучы дроў для спальвання. Вялікі крызіс на вугальным рынку прывёў да таго, што польскія горцы адчулі: іншых варыянтаў у іх няма — даводзіцца ісці па дровы, і эколагі перасцерагаюць: гэта можа мець катастрафічныя наступствы», — піша выданне.

Журналісты цытуюць Міраслава, жыхара вёскі Урублаўка: «Калі тона вугалю каштуе 4 тысячы злотых, а газ таксама дарагі, многія вырашылі, што да зімы трэба рыхтавацца самастойна. Бо ніхто з нас не жадае, каб яго сям'я змерзла. У мяне няма альтэрнатывы ацяплення дома. Я буду паліць дровамі, калі кошт вугалю раптам не ўпадзе да 2 тысяч злотых. Тады я змагу дазволіць сабе купіць яго».

У польскіх лясніцтваў ёсць ліміт штогадовай высечкі для адпаведных участкаў, аднак, як прызнаецца ляснічы Наватаргскага лясніцтва Данізль Куспер, «насамрэч ніхто не ведае, колькі дрэў у адпаведнасці з гэтым дакументам было высечана ў лясах паўднёвай Малапольшы за апошнія гады і колькі высечана цяпер».

Драўніна стала настолькі каштоўнай, што многія фермеры не пакідаюць у лесе нават галінак, якія засталіся пасля высечкі, адзначае Onet.pl. «Раней з імі абыходзіліся як з адходамі і складалі ў кучу, каб яны гнілі і забяспечвалі пажыўнае асяроддзе для падлеску. Сёння галінкі таксама забіраюць дадому, каб спаліць, — заўважае выданне. — Калі б год таму вы спыталі мясцовага жыхара, якое дрэва лепш за ўсё падыходзіць для топкі ў печцы, адказам было б: бук, ясень ці ліставіца. Пасля высечкі і сушкі гэтыя дрэвы даюць цвёрдую драўніну, якая пры спальванні доўга гарыць, дае шмат цяпла і не выклікае сажы ў коміне. Аднак цяпер у горных раёнах высякаецца літаральна ўсё. Елкі ці хвоі, якія раней лічыліся занадта смалістымі для спальвання ў печы, зараз таксама выкарыстоўваюцца». Жыхар камуны Букавіна-Татшаньская Бартламей вынес вердыкт Польшчы: «Сёння наша краіна вярнулася ў XIX стагоддзе».

ЦЭНЫ ПРЫВОДЗЯЦЬ У ЖАХ

Цэны на прадукты прыводзяць палякаў у жах. «Зіма пачынаецца, і ў нас яна будзе цяжэйшая, чым папярэдняя. Спадзяюся, Беларусь з такімі праблемамі не сутыкнецца. Раней мы проста казалі пра перспектывы крызісу, а зараз усё больш адчуваем яго. Інфляцыйныя з'явы вярнулі нас у стан, у якім мы знаходзіліся ў канцы так званых ліхіх дзевяностых, — распавёў на YouTube-канале БелТА польскі палітолаг Матэвуш Піскорскі. — Што да эканомікі, то мы практычна анулявалі большасць эканамічных дасягненняў, якія ў нас былі пасля 2004 года, калі Польшча ўступіла ў Еўрасаюз. Цяпер мы хуткімі тэмпамі вяртаемся ў дзевяностыя гады, калі мы сутыкнуліся з так званай эканамічнай трансфармацыяй краіны. Таму пакуль у Польшчы няма аптымістычных навін, чым усё гэта скончыцца на сацыяльным і палітычным узроўнях».

Палітолаг нагадаў, што ў наступным годзе ў Польшчы пройдуць выбары, таму ўсе напярадзе. Паводле яго слоў, некаторыя думаюць, што ў бліжэйшыя месяцы шмат што зменіцца. Між тым зараз палякі сутыкнуліся з імклівым ростам цэн. «Я думаю, што зараз ва ўсіх у Польшчы галоўная праблема — гэта тое, што даводзіцца некалькі разоў правяраць рахункі. Нават тыя, якія атрымліваюцца ў краме пасля паходу за прадуктамі. Больш за ўсё інфляцыя адбілася на кошце харчавання, — заўважыў Матэвуш Піскорскі. — Так што гэта датычыцца не толькі цэн на энерганосьбіты».

СПІРАЛЬ ДОЎГУ

Тым часам дзеянні ўладаў сітуацыю зусім не паляпшаюць. Партыя «Права і справядлівасць» (ПіС) за два тэрміны знаходжання ва ўладзе набрала столькі даўгоў, колькі ўсе папярэднія ўрады Польшчы за 20 гадоў, піша польскі часопіс Dziennik Polityczny. Польская эканоміка аказалася ў бядзе. Галапіруючая інфляцыя ў кастрычніку дасягнула 17,9 %. І гэта прытым, што ў краіне дзейнічае «антыінфляцыйны парасон», які плануюць адмяніць у канцы года.

Калі «Права і справядлівасць» прыйшла да ўлады, дзяржаўны доўг Польшчы складаў 969 мільярдаў злотых ($ 214,7 млрд), цяпер ён перавышае 1,5 трлн злотых ($ 332,3 млрд). «Такім чынам, можна сказаць, што за два тэрміны паўнамоцтваў урад ПіС набраў ад нашага імя амаль столькі ж, колькі ўсе папярэднія ўрады за апошнія дваццаць ці каля таго гадоў», — расказаў польскі эканаміст, былы член Савета па грашова-крэдытнай палітыцы Польшчы Багуслаў Грабоўскі. Паводле яго слоў, палякі будуць бясконца выплачваць даўгі, узятыя цяперашнім урадам.

«Горш за ўсё тое, што ўзровень дэфіцыту дзяржаўных фінансаў, гэта значыць узровень росту доўгу, ужо настолькі высокі, што ўрад не ў стане фінансаваць яго на ўнутраным рынку, выпускаючы аблігацыі ў злотых. Адбылося такое скарачэнне нацыянальных рэзерваў, што ўжо немагчыма фінансаваць такі вялікі дэфіцыт». Таму ўраду даводзіцца шукаць грошы за мяжой», — адзначае эксперт.

На думку многіх эканамістаў, палякаў чакаюць цяжкія гады. «Права і справядлівасць» прывяла да крызісу ў дзяржаве і эканоміцы, таму дзеянні, якія цяпер будуць праводзіцца, стануць балючымі», — заявіў Грабоўскі. Ён лічыць, што тым сілам, якія прыйдуць да ўлады пасля наступных парламенцкіх выбараў, давядзецца праводзіць балючую для грамадства эканамічную палітыку.

Сёння ў Польшчы ідуць спрэчкі наконт таго, як выходзіць з цяперашняга крызісу: дзейнічаць хутка ці паступова. У першым выпадку давядзецца прымаць меры, якія стануць для насельніцтва шокавай тэрапіяй. У другім выпадку працэс будзе больш ашчадным, але крызісныя з'явы працягнуцца даўжэй. На думку Багуслава Грабоўскага, другі шлях будзе цяжэйшым для бедных слаёў насельніцтва. «Інфляцыя нясе сацыяльныя выдаткі і зніжае даходы, асабліва самых нізкааплатных катэгорый грамадзян. Дык што, лепш людзям з самымі нізкімі даходамі, якія ледзь зводзяць канцы з канцамі, трываць гэты боль 5 гадоў ці 2 гады? Калі хтосьці хоча падоўжыць гэты балючы стан, рызыкаваць далейшым развіццём хваробы, то гэта прывядзе нас да крызісу, які зацягнецца на дзесяцігоддзі», — лічыць эканаміст.

Ён таксама растлумачыў, што шокавая тэрапія заключаецца ў хуткім зніжэнні дзяржаўнага доўгу і тэмпаў росту інфляцыі. «Без таго эканоміка не будзе развівацца. Згодна з прагнозамі Нацыянальнага банка Польшчы, рост ВУП у 2023 годзе складзе 0,7 працэнта, і толькі праз тры гады ён дасягне ўзроўню двух працэнтаў. Калі мы будзем развівацца так з хуткасцю 0-2 працэнта, мы не дагонім заходнееўрапейскія краіны і ўсе гэтыя 30 гадоў польскага эканамічнага цуду акажуцца марнымі», — заявіў Багуслаў Грабоўскі. Эксперт дадаў, што адказнасць за цяжкае становішча Польшчы ляжыць на ўрадзе, які гадамі павялічваў дэфіцыт бюджэту, робячы ўпор на сацыяльныя выплаты. Людзям казалі, што ў краіне ўсё добра і наперадзе чакае светлая будучыня. А насамрэч у Польшчы наспявалі праблемы. «Урад ПіС не здольны праводзіць ніякай іншай палітыкі. Яна ў іх накіравана не на макраэканамічную стабільнасць, а на куплю галасоў выбаршчыкаў», — заявіў эксперт.

У такой сітуацыі ўрад Польшчы працягвае браць у доўг. І за мяжой па-ранейшаму не супраць пазычыць Польшчы грошы, але пад высокія працэнты. «У нас рэзка ўзрос кошт абслугоўвання доўгу. Калі так здарыцца, што злоты аслабне (а мы на гэтым шляху) і нам давядзецца плаціць высокія працэнты, мы трапім у вельмі сур'ёзную спіраль доўгу», — падкрэсліў эканаміст.

МАСТЫ І АГАРОДЖЫ

У такой сітуацыі не дзіўна, што ў Беларусь з пачатку дзеяння бязвізавага рэжыму для жыхароў суседніх краін Еўрасаюза ўехала больш чым 18 тысяч грамадзян Польшчы. Імідж нашай краіны змяняецца дзякуючы таму, што многія палякі могуць завітаць да нас па бязвізе. Аб гэтым заявіў польскі палітолаг Матэвуш Піскорскі. «Многія грамадзяне Польшчы сёння наведваюць Беларусь дзякуючы бязвізу. Пачаўся дзіўны працэс. Я віншую беларускае кіраўніцтва з прыняццем такога рашэння. Нашы грамадзяне, якія наогул не цікавіліся палітыкай і верылі таму, што гавораць пра Беларусь у польскіх СМІ, прыязджаюць адтуль і публікуюць у сацсетках ролікі, нататкі, уражанні. Такім чынам, сапраўды мяняецца імідж Беларусі ў Польшчы. Яны бачаць, што такое Беларусь. Я думаю, гэта быў вельмі правільны крок. Хацелася б, каб гэтак працягвалася і як мага больш палякаў наведвала Беларусь», — заявіў палітолаг.

Разам з тым, аказваецца пэўны ціск на палякаў, якія з'ездзілі ў Беларусь ці Расію. Больш за тое, паводле слоў палітолага, ёсць выпадкі, калі ў розных дзяржаўных органаў Польшчы ўзнікаюць пытанні да такіх людзей. Тым не менш, упэўнены палітолаг, аповеды суседзям, калегам, сябрам ці знаёмым пра паездку ў Беларусь яшчэ больш эфектыўныя, чым пасты ў сацсетках ці паведамленні ў СМІ. «Па ўспамінах са сваіх шматлікіх паездак у Беларусь магу сказаць, што вы самыя адкрытыя на постсавецкай прасторы, — заўважыў Матэвуш Піскорскі. — У мяне была магчымасць наведаць большасць краін былога Савецкага Саюза, і такой адкрытасці, як у Беларусі, я нідзе не ўбачыў».

Уменне адрозніваць погляды палітыкаў Польшчы ад поглядаў простых польскіх грамадзян сведчыць аб узроўні культуры Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, лічыць Матэвуш Піскорскі. Палітолаг падзяліўся сваім меркаваннем аб віншаванні, якое беларускі лідар накіраваў польскаму народу з нагоды нацыянальнага свята незалежнасці. «Я апасаюся, што заклік Аляксандра Лукашэнкі будаваць масты сяброўства, а не агароджы, не быў пачуты. Польскае кіраўніцтва прыслухоўваецца да іншых партнёраў», — адзначыў Матэвуш Піскорскі. Тым не менш, ён распавёў, што «ёсць пэўны прагрэс» — у некалькіх польскіх СМІ з медыйнага мэйнстрыму ўсё ж з'явіліся ўрыўкі з віншавання Аляксандра Лукашэнкі. Палітолаг адзначыў: ён вельмі рады, што «ёсць нейкая частка палякаў, якая сапраўды прачытала». Спецыяліст дадаў, што Прэзідэнт Беларусі, нягледзячы на тое, што ў адносінах да яго і беларускай дзяржавы робіць польскі палітычны клас, не пераходзіць на антыпольскія пазіцыі.

Пётр ДУНЬКО.

Сямейная газета

Выпуск № 20 (202)

КАЛЯНДАР ДЛЯ МАМЫ

Як толькі выпаў снег, чую ад розных мам адно і тое ж пытанне: «А ты ўжо зрабіла адвент-каляндар для сына?» «А я Мішу купіла гатовы — з дыназаўрамі, — дзеліцца былая аднакурсніца, — старэйшая ж дачка папрасіла з упрыгажэннямі». Як той казаў, попыт нараджае прапанову, таму сёння ў крамах хапае розных адвент-календароў на любы густ і кашалёк — з мініяцюрнымі шакаладкамі, пластыкавымі жывёлінкамі, фігуркамі Lego на кожны дзень чакання Каляд ці Новага года. І, шчыра прызнацца, я спачатку ледзь не паддалася ўсеагульнай паніцы. Але потым расслабілася і замест таго, каб бегаць па крамах, скупляючы непатрэбныя дробязі, штовечар гуляю з Сымонам у яго ўлюбёныя «кошкі-мышкі». Бо, колькі б мы ні набывалі сваім дзецям цацак ды цукерак, яны ніколі не заменяць самага галоўнага. «Насамрэч, няважна, ці ёсць у сына новыя красоўкі, паступіў ён у каледж сваёй мары і ці хопіць у вас грошай, каб купіць яму дарагую цацку, — піша Мэг Мікер у кнізе «Мама і сын». — Усё гэта цудоўна, але рэчы не зробяць з дзіцяці шчаслівага чалавека. Што сапраўды прыносіць яму шчасце — час, які вы правялі з ім твар у твар». Менавіта таму, калі я і буду рыхтаваць адвент-каляндар, дык толькі так, як тое робіць мама Льва. Яна на кожны дзень чакання Каляд прыдумала для свайго сына цікавыя заданні. З таго, што мне запомнілася, — правесці рэвізію цацак і адкласці неактуальныя для іншых дзетак; намаляваць калядныя паштоўкі бабулям і дзядулям, патэфанаваць ім і распавесці, што падабаецца ў іх больш за ўсё...

Днямі я размаўляла са сваёй сяброўкай. Яна падзялілася, што цэлы месяц дачушка хварэе, таму ў яе зусім не было часу запоўніць усе кішэнькі вечнага адвент-календара, які пашыла летась з тканіны. Таму падкладвае малечы сюрпрызы дзень у дзень. Адчувалася, што сяброўка (якая, як і большасць з нас, імкнецца быць ідэальнай мамай і ўсё паспяваць) з-за гэтага вельмі перажывае. Але, як для мяне, цудоўна, што жыццё прымусіла яе пакінуць месца для экспромта. Тым больш сумняваюся, што дзіцяці ў тры гады хопіць цярпення, каб не зазірнуць ва ўсе кішэнькі адразу.

Ды і наогул... Мне здаецца, што для таго каб стварыць у доме чароўную атмасферу падчас чакання свят, зусім не абавязкова не спаць начамі, каб арыгінальна афарміць 24 (некаторыя робяць 31!) пакуначкі і прадумаць, чым іх запоўніць. Гэта ўсё — вонкава прыгожанькае, «інстаграмнае» — патрэбна збольшага мамам, а не дзецям. Асабліва калі апошнім два, тры ці чатыры гадкі. У прыватнасці, мы з Сымонам, нягледзячы на адсутнасць адвент-календара, апошнія два гады таксама рыхтуемся да зімніх свят. Малюем ліст Зюзю і адносім яго ў лес. Разам замешваем цеста і пры дапамозе формачак выразаем імбірнае печыва. Упрыгожваем драўляную ёлку, якую зрабіў муж, драўлянымі сняжынкамі, а дрэвы ў дварэ — самаробнымі ледзянымі цацкамі. Робім снежных анёлаў па дарозе на навагоднія спектаклі. Але ўсё гэта не «жалезна», па адвент-календары, а спантанна, «пад натхненне».

«Я сваім дзецям і хроснікам сёлета куплю кветкі пад ёлачкі, — падзялілася планамі наконт навагодніх падарункаў Алёна. — 12-годку павяду ў тэатр музкамедыі, малодшых — у музей, дзяцей кумоў адпраўлю ў цырк на навагоднее прадстаўленне. Склад цацак усіх ужо стаміў, буду дарыць эмоцыі і сумеснае баўленне часу».

А наогул, як ні круці, найлепшы падарунак для дзіцяці — рэсурсная (у сэнсе нервовых клетак) мама. Таму перад Новым годам я вырашыла паклапаціцца ў тым ліку і пра сябе. І зладзіць уласны адвент. Якраз на дзень нараджэння сяброўка падарыла мне кнігу Вольгі Прымачэнкі пра тое, як цаніць і берагчы сябе. У канцы яе — марафон пяшчоты да сябе, разлічаны на 31 дзень. Адмыслова для гэтага я завяла асобны нататнічак. І вось ужо восьмы дзень выконваю розныя рэсурсныя заданні. Напрыклад, сёння папрашу свайго мужа пабыць маім «добрым люстэркам» і напісаць, што яго ўва мне захапляе, у чым, на яго погляд, мой дар. А потым абавязкова сама падпішу такую паштоўку сілы для кагосьці са сваіх знаёмых.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Тыя, хто побач

«Жонка прасіла, каб я нікому не аддаваў дзяцей»

Правілы жыцця таты-адзіночкі

Пра лёс Ілы МІХАЛЬЧАНКІ можна смела здымаць фільм. Для мяне ён быў бы ў першую чаргу пра любоў, самаадданасць, мужчынскую адказнасць і сілу духу. Ілы было 31, калі ў яго жыцці здарылася бяда — памерла жонка Святлана. Мужчына застаўся адзін з двума сынамі на руках. Малодшаму, Захару, на той момант споўнілася ўсяго паўтара гадкі... Першы час ён нават зрэдку называў тату мамай.

«ДА АПОШНЯГА СПАДЗЯВАЎСЯ НА ЛЕПШАЕ»

— **Неўзабаве пасля нараджэння Захара Святлане паставілі страшны дыягназ:** бакавы аміятрафічны склероз. У свеце вядомы толькі два чалавекі, якія з гэтай рэдкай хваробай пражылі дастаткова доўга. Адзін з іх — славуты фізік Стывен Хокінг. Прагноз быў бязлітасны, але я да апошняга спадзяваўся на лепшае. Па ўдакладненне дыягназу мы са Светай паляцелі ў Ізраіль, выдаткаваўшы на гэта ўсе свае зберажэнні. Медыкі і там развялі рукамі: «На жаль, з гэтым нічога нельга зрабіць». Але гэта быў шанц, і мы зусім без шкадавання яго выкарысталі.

Хвароба прагрэсіравала вельмі хутка. Літаральна праз паўгода жонка апынулася ў інваліднай калясцы. У Светы развіваўся параліч, які паступова адбіраў у яе магчымасць хадзіць, гаварыць, глытаць, дыхаць...

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Школа даверу

Урокі для... мужчын

Ці трэба вучыцца, каб мець поспех у выхаванні дзяцей?

Фота Лізаветы ГОПАД.

Магчыма, многія мужчыны ўспрымуць такую прапанову без асаблівага энтузіязму. Маўляў, якая тут патрэбна навука? У бацькі самы важны клопат — забяспечыць сям'ю, зарабіць грошы, па магчымасці задаволіць патрэбы дзяцей, а з выхаваннем няхай спраўляецца маці. Праўда, такі стэрэатып пачаў адыходзіць у мінулае. Сучасныя таты ўжо не хочуць стаяць убаку ад сямейнага жыцця, а імкнуцца наладжваць з дзецьмі кантакт. Каб дапамагчы бацькам умацаваць сям'ю, стаць сваім дзецям сапраўдным сябрам і дарадчыкам, у Гродне збіраюць татаў на пасяджэнні тата-школы «Давер».

Ініцыятарамі школы татаў сталі жанчыны. Ідэю прапанавалі прадстаўніцы гродзенскага аддзялення Беларускага саюза жанчын, а вось яе рэалізацыяй заняліся супрацоўніцы абласнога Інстытута развіцця адукацыі. Менавіта тут ужо некалькі гадоў збіраюцца прадстаўнікі моцнай палавіны, каб спасцігнуць ролю таты ў сям'і, абмеркаваць з прафесійным псіхолагам пэўныя праблемныя моманты, рыняць удзел у ролевых гульнях і майстар-класах. Сёлета такія заняткі прайшлі пяты раз і сабралі 40 чалавек з усёй вобласці.

— Гэта таты розных пакаленняў: і тыя, у каго салідны стаж, і тыя, хто нядаўна стаў татам, і тыя, хто яшчэ ім будзе. Мы не чытаем лекцыі, а працуем інтэрактыўна. Гэта свайго роду псіхолага-педагагічная майстэрня, дзе педагогі, псіхолагі, спецыялісты розных профіляў вучаць праз гульні разбіраць жыццёвыя сітуацыі, — тлумачыць старшыня абласнога аддзялення Беларускага саюза жанчын Ірына СЦЕПАНЕНКА.

На занятках таты не проста слухаюць вызначаны курс паспяховага бацькоўства, а праходзяць пяць этапаў навучання. Увесь калектыў разбіваецца на некалькі груп, і яны па чарзе пераходзяць з адной аўдыторыі ў другую, дзе іх чакаюць выкладчыкі і цікавыя тэмы. Напрыклад, на першым этапе татаў вучаць быць мудрымі. Што гэта значыць у сямейным кантэксце? Па словах арганізатараў, мудрасць з боку таты трэба разумець як адказнасць.

— Мы вучым важным аспектам адказнасці ў сям'і, бо калі тата адказны, то і дзеці будуць такімі. Менавіта тата фарміруе ў дзяцей гэту якасць. Ёсць заняткі, на якіх вучаць сумеснай гульні з дзецьмі. Асобны курс прысвечаны праблемам выхавання ў сям'і, у прыватнасці як выходзіць са складаных сітуацый. Гэтыя невялікія урокі — вялікі задзел для будучага паспяховага жыцця не толькі нашых татаў, але і ўсёй сям'і, — упэўнена прадстаўніца жаночай арганізацыі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

Пытанне псіхолагу

У садку — анёлак, а дома — капрызуля

«Дзіўна, але мой 4-гадовы сын у дзіцячым садку зусім не такі, як дома. Мне нават крыўдна, бо я так стараюся, а ён там, з чужымі людзьмі, значна лепш сябе паводзіць, чым са мной. Па-першае, у садку ён есць усё, а дома я за ім бегаю з лыжкай і ўпрошваю. Па-другое, там ён сам апранаецца. Але варта прыйсці мне яго забіраць — сядзіць на лавачцы і кажа: «Мама, апрані мяне!». Я дома змагаюся з непаслухмяным капрызулем, а выхавальніца кажа: «Які ў вас самастойны, спакойны хлопчык!». Так можа развіцца комплекс непаўнацэннай мамы. Што я раблю не так?»

Алеся Рамановіч, *г. Мінск.*

— Дзеці, дарэчы, як і мы, дарослыя, паводзяць сябе з рознымі людзьмі па-рознаму, — адказвае **дзіцячы псіхолаг Людміла ГУБСКАЯ.** — Але менавіта маме звычайна дастаюцца самыя складаныя формы паводзін, бо побач з ёй дзіця адчувае сябе ў бяспецы, таму не стрымлівае сябе. Як правіла, для малечы садок — месца, дзе яго ўспрымаюць такім, якім ён сябе пакажа. Таму туды ён прыносіць тую форму паводзін, якая, як ён лічыць, больш за ўсё цэніцца выхавальніцай і нянечкай. Дома ж ён «стаіць на галаве», адпачываючы ад цяжкай сацыяльнай ролі «ўзорнага дзіцяці». Зразумела, бацькам, асабліва мамам, бывае крыўдна, што сын ці дачка добра паводзяць сябе з іншымі, а з імі капрызяць. Аднак важна разумець, што ў чатыры гады дзіця пакуль не можа пастаянна быць самастойным, «дарослым», а непаслухмянасць менавіта з блізкімі людзьмі азначае, што яно стараецца прыстасавацца да грамадства і затрачвае на тое шмат сіл. Толькі самым блізкім яно можа цалкам і без аглядкі даверыць свае трывогі і эмоцыі.

Раю бацькам зняць дзіця, якое, разваліўшыся ў крэсле, крышыць на стол хлеб, на відэакамеру і паказаць, як яго капрызы выглядаюць з боку. Пасля таго паводзіны вельмі часта мяняюцца ў лепшы бок. Часта дзеці прывыкаюць выкарыстоўваць маму для вырашэння тых спраў, якія ім самім не хочацца рабіць. «Пакармі мяне, апрані...» Важна своечасова пераключыцца з такіх формаў паводзін. Як толькі ўбачылі, што сын сам змог нацягнуць шкарпэткі, трэба перадаць яму тыя паўнамоцтвы, каб дзіця разумела, што гэта яго адказнасць. Калі дзеці, якія самастойна ніколі не апраналіся, ідуць у школу, ім бывае складана. Трэба за адзін перапынак пераапрануцца пасля фізкультуры і паспець збегаць у сталовую, і яны не ўкладваюцца ў адведзены час. Для дзіцяці гэта вялікі стрэс, больш за тое, апошняе можа стаць прычынай насмешак з боку аднакласнікаў. Таму раю бацькам не рабіць свайму дзіцяці мядзведжую паслугу, выконваючы за яго тое, што малеча ў стане рабіць самастойна.

Пры гэтым будзьце паслядоўнымі і не імкніцеся вырашыць усе праблемы адначасова. Немагчыма, каб у адно імгненне дзіця пачало самастойна есці, адзявацца і завязваць шнуркі, нават калі яно тое ж робіць у дзіцячым садку. Эфектыўна ў такім узросце прывесці як прыклад любімага героя мультфільма ці сказаць: «Глядзі, коцік і той сам мыецца, і ў цябе таксама атрымаецца — паспрабуй».

Тое, як дзіця паводзіць сябе з бацькамі, не з'яўляецца паказчыкам правільнага ці няправільна выхавання. На псіхалагічных кансультацыях па паводзінах дзяцей дадзенага ўзросту я спачатку выслухоўваю скаргі мамы. А потым пытаюся, ці ёсць гэтыя ж скаргі з боку выхавальніцы, бабулі. Калі мама кажа: «Не, з іншымі людзьмі — ідэальнае дзіця», значыць, яна робіць усё правільна. Больш за тое, менавіта дзякуючы таму, што мама робіць усё правільна, дзіця за межамі дому паводзіць сябе добра і ўсе яго хваляць».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Урокі для... мужчын

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Пад уплывам такой грунтоўнай прэзентацыі праекта з боку арганізатараў разам з татамі накіроўваюся ў аўдыторыю, дзе гаворка якраз і пойдзе пра наладжванне кантактаў з дзецьмі. Заняткі вядзе старшы выкладчык кафедры псіхолага-педагагічнага суправаджэння абласнога Інстытута развіцця адукацыі Вольга Салавей. Яна прыводзіць такія вынікі даследавання. Напрыклад, чытанне і купанне дзеці малодшага ўзросту лічаць самымі шчаслівымі, калі тое робіць тата. Са старэйшымі — абмеркаванне песень, выступленні, гульні, спорт, тое, што для дзіцяці важна. Пры гэтым неабходна сфарміраваць даверлівыя адносіны — не толькі нешта выпытваць у дзяцей, але і расказваць пра сябе. «Калі вы не расказваеце пра сябе — чаму дзіця будзе расказваць пра сябе?» — задаецца пытаннем куратар секцыі. Па словах псіхолага, дзіцяці дастаткова ад 15 да 30 хвілін якасных зносін з татам у дзень. Гэта тая сітуацыя, калі будзе камфортна. Але толькі ў выпадку, калі такая гутарка вядзецца ў спакойнай утульнай абстаноўцы, а не па тэлефоне ці на хаду. Лічыцца, што дзеці растуць шчаслівымі, калі на кожную сварку і спрэчку прыходзіцца пяць пазітыўных момантаў. Вядома, нельга ўвесь час толькі гладзіць дзяцей па галаве і спускаць іх правіннасці на тармазах. Але яшчэ горш — не заўважаць іх поспехі і забываць пра пазітыў. Часта для кантактаў дастаткова проста прайсціся пешшу, пры гэтым нетаропка, без спешкі, абмеркаваць тое, што адбылося за дзень, альбо іншыя важныя моманты ў жыцці дзіцяці. «Хто можа ўспомніць, калі гуляў са сваім дзіцем удваіх?» — задае Вольга Салавей пытанне зале. Аказалася, што такіх бацькоў — адзінкі.

— Многія згодныя з нашымі рэкамендацыямі, але не ўсе іх выконваюць. Мы спяшаемся, ляцім, рытм жыцця высокі, імкнёмся зрабіць як мага больш, а дзеці адыходзяць на другі план. Так не павінна быць, — лічыць выкладчыца.

Вядома, нельга ўвесь час толькі гладзіць дзяцей па галаве і спускаць іх правіннасці на тармазах. Але яшчэ горш — не заўважаць іх поспехі і забываць пра пазітыў.

Знаёмлюся са шматдзетным татам Ігарам Макарчыкам з Дзятлаўскага раёна. У яго трое дзяцей, старэйшаму сыну 16 — пераходны ўзрост. Менавіта дадзеная акалічнасць і стала нагодай для таго, каб наведаць заняткі. Па словах Ігара Макарчыка, яму важна даведацца, як будаваць адносіны з падлеткам. Яго насцярожвае інфантыльнасць падрастаючага пакалення і фанатычная залежнасць ад гаджэтаў. Між тым, не ўсё, на думку шматдзетнага таты, залежыць ад бацькоў. Тэхнічны прагрэс не стаіць на месцы, і маладое пакаленне — яго актыўныя карыстальнікі. Але тут праблема яшчэ і ў спажывецкім падыходзе новага пакалення да грамадства.

Ігар кажа, што стараецца развіваць схільнасці дзяцей, цікавіцца іх поспехамі. У іх, можна сказаць, спартыўная сям'я. Сам бацька часта гуляе ў футбол, нават выступае за каманду раёна, бярэ на гэтыя гульні і старэйшага сына. Праўда, той бачыць сябе ў IT-сферы. Затое сярэдні, на яго думку, мае спартыўныя перспектывы. Ён бярэ ўдзел у спаборніцтвах «Залатая шайба», каманда два разы была прызёрам рэспубліканскаіх спаборніцтваў. Малодшай дачцэ таксама падабаецца хакей.

А вось Валерый Булойчык з Навагрудскага раёна яшчэ толькі вучыцца быць бацькам. Яго сыну ўсяго сем месяцаў. Тым не менш, малады тата ўжо вызначыў падыходы

да яго будучага выхавання на прыкладзе сваіх сяброў. Па яго словах, усе яны ўдзельнічаюць у выхаванні сваіх дзяцей, займаюцца з імі спортам, турызмам, гаспадарчымі справамі. На думку Валерыя, важна навучыць малых уменню паклапаціцца аб сабе, а таксама быць побач на працягу іх сталення, каб адпусціць у жыццё падрыхтаванымі. Малады тата ўпэўнены: мужчына павінен умець забяспечваць сябе і сваю сям'ю. Але каб данесці жыццёвыя прынцыпы, трэба ўмець выбудоўваць адносіны з сынам. Для гэтага Валерый і прыехаў на заняткі тата-школы. Кажа, што атрымаў на будучыню вельмі карысную інфармацыю. Асабліва падчас псіхалагічнага майстар-класа, дзе ішла разборка некаторых сямейных сітуацый.

Напрыклад, падчас дыялогу важна, каб вочы бацькі былі на ўзроўні вачэй сына альбо дачкі. Не варта стаяць над дзіцем грознай хмарай. Са старэйшымі лепш сесці і абмеркаваць сітуацыю. Гатовыя «інструкцыі» мала што дадуць. Гэта ў жыцці бацькоў так было — у дзяцей павінна быць па-іншаму. Таксама спецыялісты не раяць татам капіраваць паводзіны іншых членаў сям'і — трэба мець уласны аўтарытэт.

Як адзначылі арганізатары тата-школы, сучасныя мужчыны імкнуцца быць паспяховымі не толькі ў кар'еры, але і ў выхаванні дзяцей. Аўдыторыя паспяховых татаў пашыраецца. Да такога руху далучаюцца і раёны. Падобныя школы існуюць, напрыклад, у Ваўкавыскім і Астравецкім раёнах. А ў Іўі клуб татаў арганізаваў дырэктар мясцовай школы Аляксандр Раманюк.

— Абмяркоўваем надзённае — сям'ю, дзяцей, разважаем аб выхаванні, праблемах. Як правіла, выносім актуальнае пытанне на парадак дня, і кожны дзеліцца сваім бачаннем. Хтосьці дае параду са свайго вопыту. Напрыклад, адзін наш удзельнік клуба расказаў, што мала ўвагі ўдзяляў старэйшаму сыну. А ў выніку ў таго праблемы з дысцыплінай, не так добра вучыцца, як мог бы. Цяпер, калі нарадзілася другое дзіця, тата стараецца не ўпусціць момант, пастаянна водзіць малодшага сына ў садок. Гэты чалавек вучыцца на сваіх памылках.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

З нагоды

ПАДЛЕТКАМ 12+

Лекцыі, інтэрактыўныя квізы і размовы пра псіхалагічнае здароўе

Усё гэта чакае беларускіх тынэйджараў на маштабнай канферэнцыі для падлеткаў, якая пройдзе ў Мінску 11 снежня. Арганізатары мерапрыемства маюць на мэце растлумачыць падлеткам, што звяртацца па дапамогу — нармальна, і абяцаюць расказаць, як і дзе яе можна знайсці. У прыватнасці, на платформе talk2ok.by, дзе хлопцы і дзяўчаты могуць атрымаць бясплатную і канфідэнцыяльную кансультацыю псіхолага і падтрымку аднагодкаў.

Мэта канферэнцыі, якую ладзіць Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі, — падкрэсліць важнасць клопату не толькі пра фізічнае, але і пра псіхалагічнае здароўе падлеткаў. Яны — асабліва ўразлівая катэгорыя, паколькі ў гэты час пастаянна адбываюцца змены як іх асяроддзя, так і ўласнага цела. Калі побач ёсць падтрымка значных для падлетка дарослых (бацькі, трэнер, настаўнік, сваякі), — гэта добра. Калі такіх людзей няма, то нармальна звярнуцца па параду да псіхолага, запэўніваюць у арганізацыі.

Падлеткі часта сутыкаюцца з псіхалагічнымі праблемамі, і некаторым з іх асабліва цяжка. Як сведчаць даследаванні 2018 года, 26 % моладзі ад 14 да 19 гадоў маюць суіцыдальныя думкі, а ў 18 % моладзі назіраюцца дэпрэсіўныя сімптомы. Вельмі важна, каб падлеткі, звяртаючыся па псіхалагічную дапамогу, не баяліся, што з іх будуць смяяцца аднагодкі ці ганьбіць дарослыя. Патрэбна глабальная перабудова ўсёй работы з псіхічным здароўем чалавека. Неабходна ўцягваць у такую работу не толькі саму моладзь, але і бацькоў з настаўнікамі.

На канферэнцыі выступяць псіхолагі, якія раскажуць пра псіхалагічнае здароўе і парэкамендуюць, як яго падтрымліваць і захоўваць раўнавагу. Пра ўпэўненасць у сабе хлопцы і дзяўчаты змогуць пагаварыць, напрыклад, з акцёрам Ягорам Сізавым і дзіцячым псіхолагам Галінай Швец. А са стылістам Ліліяй Рыхтэр і псіхолагам Вікторыяй Крачко — абмеркаваць, як перастаць перажываць з-за знешнасці. Папулярны блогер Улад Кабякоў падзеліцца сваёй гісторыяй, як ён пераадольвае цяжкасці і клапоціцца пра сваё псіхалагічнае здароўе. Падчас мерапрыемства падлеткам раскажуць таксама пра новую платформу talk2ok.by, якую ўвосень арганізацыя ЮНІСЕФ запусціла сумесна з экспертамі Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі БДПУ.

Уваход на канферэнцыю вольны. Аднак колькасць месцаў абмежаваная, таму лепш загадзя зарэгістравацца на https://www.unicef.by/uniceftalks2022/. Будынак, дзе пройдзе канферэнцыя, абсталяваны таксама і для ўваходу людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Арганізатары канферэнцыі лічаць, што змены неабходныя ў чатырох абласцях, якія могуць найбольш паўплываць на псіхічнае здароўе дзяцей і падлеткаў: выдзяленне фінансавання на праграмы па ахове псіхалагічнага здароўя; прасоўванне бацькоўскіх і сямейных практык, скіраваных на пазітыўнае выхаванне і падтрымку псіхалагічнага дабрабыту бацькоў і апекуноў; развіццё дружалюбнага асяроддзя ў школах і доступу да паслуг псіхалагічнай дапамогі ў навучальных установах; змена стаўлення грамадства да пытанняў псіхалагічнага здароўя і барацьба з дыскрымінацыяй.

Ірына СІДАРОК.

Супраць гвалту

І З ТУПІКА ЁСЦЬ ВЫЙСЦЕ

Знайсці ўправу на дэбашыра не толькі можна, а і неабходна

Пра сямейныя скандалы, якія заканчваюцца бойкамі і, на жаль, нават гібеллю жанчын, перыядычна паведамляюць крымінальныя зводкі. Адзін з нядаўніх выпадкаў, пра які расказалі ў Генеральнай пракуратуры, скончыўся не зусім тыпова: у дачыненні да 37-гадовага жыхара Нясвіжа раённы пракурор распачаў крымінальную справу. Пры гэтым жонка адмовілася падаваць заяву для прыцягнення мужа да крымінальнай адказнасці. Адметна, што такія паводзіны пацярпелых ад хатняга гвалту назіраюцца часта.

Сітуацыя распаўсюджаная: падазраваны выпіваў і ўчыняў дома скандалы. Паводле даных пракуратуры, з сакавіка 2021 да верасня 2022 года ён сістэматычна катаваў сваю 35-гадовую жонку. Раней яго неаднаразова прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці па эпізодах хатняга гвалту і паставілі на прафілактычны ўлік у міліцыі.

Апошнім часам спрошчаны парадак аказання паслугі часовага прытулку і комплекснай дапамогі пацярпелым ад хатняга гвалту. Доступ у крызісны пакой цяпер кругласутачны, нумары спецыялістаў, якія яго дадуць уначы, маюцца на сайтах устаноў і ў інфармацыйных буклетах. Пражыванне бясплатнае. Там выдзяляюць не толькі спальнае месца і пасцельную бялізну, але пры неабходнасці і сродкі асабістай гігіены, і харчаванне.

Акрамя таго, у дачыненні да яго выносілася ахоўнае прадпісанне, аб'яўлялася пракурорскае папярэджанне. Аднак усё аказалася марным, меры на мужчыну не падзейнічалі. У пракуратуры палічылі, што такім чынам закрануты інтарэсы дзяржавы і грамадства па забеспячэнні недатыкальнасці асобы, абароны жыцця і здароўя ад злачынных замахаў. Акрамя таго, мужчына схільны да агрэсіі, прымянення фізічнага і псіхалагічнага гвалту і можа здзейсніць у дачыненні да жонкі больш цяжкае злачынства, у тым ліку супраць яе жыцця і здароўя. Крымінальную справу завялі без заявы жонкі.

70 ТЫСЯЧ ВЫПАДКАЎ ЗА ГОД

Сёлета органы ўнутраных спраў зарэгістравалі каля 70 тысяч фактаў хатняга гвалту. З іх каля 15 тысяч — адміністрацыйныя правапарушэнні, а больш за 2,5 тысячы — крымінальныя.

— У бягучым годзе ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага адзначаецца зніжэнне зарэгістраваных цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў супраць жыцця і здароўя — забойстваў, цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Калі летась было зарэгістравана 76 забойстваў, то сёлета 69, наўмысных прычыненняў цяжкіх цялесных пашкоджанняў 156 і 126 адпаведна, — прыводзіць лічбы **намеснік начальніка ўпраўлення прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Канстанцін РУЦ.**

Сёлета змянілася і заканадаўства, у прыватнасці Закон «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў». Згодна з ім, пашырылася кола асоб, гвалт у дачыненні да якіх разглядаецца як хатні. Цяпер да хатняга гвалту прыраўноўваюцца канфлікты паміж былымі мужам і жонкай; грамадзянамі, якія маюць агульнае дзіця; сваякамі, што пражываюць раздзельна; грамадзянамі, якія пражываюць пад адным дахам.

Таксама зменены парадак прымянення ахоўнага прадпісання. Раней яно выносілася толькі пасля паўторнага здзяйснення аналагічнага правапарушэння. Сёння ж апошняе прымяняецца на стадыі правядзення праверкі і падрыхтоўкі справы аб адміністрацыйным правапарушэнні ці пры завядзенні крымінальнай справы. Ужо прыменена 13,3 тысячы ахоўных прадпісанняў, з іх 10 тысяч — з адсяленнем дэбашыраў з сям'і.

— Раней жанчына была вымушана сыходзіць з дому. Тое, што цяпер яна з дзецьмі можа застацца ў звыклай абстаноўцы, а высяляюць агрэсара, — вельмі важная мера, — адзначае **кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алена КОМЛІК.** — Тое, што павялічваецца колькасць ахоўных прадпісанняў — добрая тэндэнцыя, бо агрэсар разумее, што можа быць пакараны высяленнем з уласнага дому. Гэта вельмі выцверажальная норма.

ШУКАЦЬ ДАПАМОГУ БОЛЬШ АКТЫЎНА

У нашай краіне ва ўсіх 146 тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і двух гарадскіх цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей (у Гомелі і Мінску) аказваюцца кансультацыйна-інфармацыйныя, сацыяльна-псіхалагічныя паслугі, а таксама даюцца сацыяльны патранат і часовы прытулак.

Штогод у цэнтры звяртаецца каля 11 тысяч грамадзян, якія пацярпелі ад хатняга гвалту, з іх 2,5 тысячы — сем'і з дзецьмі да 18 гадоў. Найбольш запатрабаваныя кансультацыйна-інфармацыйныя паслугі (іх атрымлівае каля 80 % ад тых, хто звярнуўся), і сацыяльна-псіхалагічныя (аказваюцца 60 %).

Тыя, хто мае патрэбу ў бяспечным прытулку, могуць атрымаць часовае месца. Па ўсёй Беларусі створана сетка са 136 крызісных пакояў, дзе маецца 131 ложка-месца, у тым ліку 126 ложка-месцаў для дзяцей. Вялікая частка крызісных ложкаў (47 %) размешчана на базе тэрытарыяльных цэнтраў, у тым ліку на базе аддзяленняў кругласутачнага знаходжання. Таксама крызісныя пакоі размяшчаюцца ў кватэрах, дамах, установах адукацыі, аховы здароўя, гасцініцах, інтэрнатах.

— У многіх краінах практыка іншая: ёсць дом, у які селяцца толькі ахвяры хатняга гвалту, і іх 2-3 па краіне. Але мы пайшлі іншым шляхам. Нашы жанчыны прывязаны да працы, дзіцячых садкоў, устаноў адукацыі, дзе вучацца дзеці. Таму прынята рашэнне забяспечыць шырокі доступ, каб дапамога мелася ў кожным раёне і не трэба было кудысьці ехаць, — каментуе Алена Комлік.

У 2021 годзе паслуга часовага прытулку была аказана 630 грамадзянам, у тым ліку 340 пацярпелым ад хатняга гвалту, сярод іх 66 сем'яў са 132 дзецьмі. За першае паўгоддзе гэтага года да сацыяльных службаў звярнулася каля 5 тысяч чалавек, якія пацярпелі ад гвалту ў сям'і, больш чым 140 жанчынам спатрэбіўся часовы прытулак у крызісных пакоях.

— За апошнія пяць гадоў пацярпелыя ад хатняга гвалту ў тры разы часцей сталі звяртацца ў крызісныя пакоі. Гэта ўлічваючы той факт, што ёсць магчымасць адсялення дэбашыра, — адзначае Алена Комлік. — Каля 85—90 % зваротаў — жанчыны з дзецьмі. Але ёсць і мужчыны, у асноўным пажылога ўзросту. Як правіла, гэта калі бацька ў маладосці быў агрэсарам, вырасціў дзяцей, якія цяпер учыняюць гвалт у адносінах да яго. Ніхто з іх не ўмее камунікаваць нармальна, а кантактуюць шляхам агрэсіі.

Апошнім часам спрошчаны парадак аказання паслугі часовага прытулку і комплекснай дапамогі пацярпелым ад хатняга гвалту. Доступ у крызісны пакой цяпер кругласутачны, нумары спецыялістаў, якія яго дадуць уначы, маюцца на сайтах устаноў і ў інфармацыйных буклетах. Пражыванне бясплатнае. Там выдзяляюць не толькі спальнае месца і пасцельную бялізну, але пры неабходнасці і сродкі асабістай гігіены, і харчаванне.

Паслуга аказваецца незалежна ад месца пражывання і рэгістрацыі, а ў выпадку экстраннай неабходнасці — без дакументаў, якія пацвярджаюць асобу.

Тэрмін пражывання ў крызісных пакоях неабмежаваны і вызначаецца дагаворам, можа быць падоўжаны з улікам канкрэтнай жыццёвай сітуацыі. Усім пацярпелым у цэнтрах апроч гэтага аказваюцца псіхалагічныя, кансультацыйна-інфармацыйныя паслугі, а пры неабходнасці і садзейнічанне ў працаўладкаванні, пошуку жылля, наладжванні сувязяў са сваякамі.

З пацярпелымі можа заключацца паслуга сацыяльнага патранату. Гэта суправаджэнне для асоб, якія аказаліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, накіраванае на аднаўленне нармальнай жыццядзейнасці і вырэшэнне праблем. У першым паўгоддзі бягучага года паслуга сацыяльнага патранату аказана 200 пацярпелым ад хатняга гвалту.

ДЗЕЦІ АГРЭСАРАЎ МАЮЦЬ ПСІХАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ

Недахоп інфармацыі з'яўляецца асноўнай прычынай, па якой ахвяры гвалту не спяшаюцца звяртацца па медыцынскую і псіхалагічную дапамогу.

— Праблема хатняга гвалту абцяжарваецца тым, што ўсё адбываецца за зачыненымі дзвярыма і, як правіла, не выносіцца вонкі, таму часта немагчыма аказаць больш кваліфікаваную дапамогу, — адзначае **намеснік дырэктара па медыцынскай частцы РНПЦ псіхічнага здароўя Вера ІВАНІЦКАЯ.** — Сітуацыя абцяжарваецца тым, што чалавек кантралюе ў сям'і іншага чалавека насуперак яго волі, і ахвяра аказваецца ў цяжкай сітуацыі з-за ізаляцыі, кантролю, нейкіх нездаровых сувязяў, якія траўміруюць, недахопу фінансавых рэсурсаў, страху, сораму і з-за дзяцей.

Дарэчы, дзеці, якія жывуць у сям'і, дзе практыкуецца гвалт, часта маюць псіхалагічныя праблемы з ранняга ўзросту. Для іх характэрныя ўцёкі з дому, павышаная трывожнасць, некантраляваная агрэсія.

Алена КРАВЕЦ.

Сёлета змянілася і заканадаўства, у прыватнасці, Закон «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў». Згодна з ім, пашырылася кола асоб, гвалт у дачыненні да якіх разглядаецца як хатні. Цяпер да хатняга гвалту прыраўноўваюцца канфлікты паміж былымі мужам і жонкай грамадзянамі, якія маюць агульнае дзіця; сваякамі, што пражываюць раздзельна; грамадзянамі, якія пражываюць пад адным дахам.

Куды звяртацца, калі з цябе здзекуюцца

Калі вы разумееце, што ў адносінах да вас прыменены хатні гвалт, вашаму жыццю і здароўю пагражаюць, тэлефануйце 102. На працягу 15 хвілін да вас прыедуць праваахоўнікі і правядуць разбор. Калі жадаеце прыцягнуць агрэсара да адміністрацыйнай адказнасці, звяртайцеся да іх з пісьмовай заявай. Можна звярнуцца да супрацоўнікаў міліцыі і з просьбай прымяніць ахоўнае прадпісанне для адсялення дэбашыра. У асобных выпадках прымяняецца такая мера, як затрыманне агрэсара. Ён знаходзіцца пад вартай да разгляду матэрыялаў у судзе.

Нават калі вашаму жыццю і здароўю нічога не пагражае, але вам не ўдаецца наладзіць дыялог у сям'і, можна звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе вам акажуць дапамогу. Памятайце, што гвалт бывае не толькі сексуальны ці фізічны — не менш небяспечны і псіхалагічны, і цярпець яго таксама не варта.

У рабочы час варта звяртацца па тэлефонах тэрытарыяльных цэнтраў, у вячэрні і начны час можна звярнуцца па мабільных нумарах псіхолагаў, якія ўказаны на адпаведных сайтах. Крызісны пакой да вашых паслуг — калі вы проста жадаеце пакінуць дом і не хочаце звяртацца ў міліцыю.

Па псіхалагічную дапамогу можна звяртацца ў спецыялізаваныя арганізацыі, як правіла, медустановы. У кожнай такой арганізацыі ёсць тэлефоны даверу, нумары ўказаны на сайтах. Існуе такі нумар і ў РНПЦ псіхічнага здароўя, па тэлефоне 8-017 272 21 67 у рабочыя дні можна атрымаць дапамогу высокакваліфікаваных псіхолагаў. Ёсць шматканальны кругласутачны тэлефон, дзе дзяжураць спецыялісты, якія акажуць дапамогу.

— Па дапамогу лепш звяртацца да спецыялістаў. Погляд прафесійнага псіхолага — погляд збоку і ён здольны змяніць і стаўленне чалавека да праблемы, і яго далейшыя паводзіны, — рэзюмуе Вера Іваніцкая.

Далікатная тэма

Як расказаць «пра гэта» правільна?

Секс у нас ужо ёсць. А што з сістэмай палавога выхавання?

Сучасныя адукаваныя бацькі і сёння часам адчуваюць няёмкасць, абмяркоўваючы з сынамі і дочкамі інтымны бок жыцця. Як рабіць гэта правільна? На што звяртаць увагу, каб фарміраваць у сваіх нашчадкаў здаровую сексуальнасць? Чаму важна распрацаваць сістэму палавога выхавання ад дзіцячых садкоў да ВНУ? Гутарым пра гэта з псіхолагам Таццянай ШАРАНДОЙ.

Фота аўтара.

— Сёння дастаткова распаўсюджана меркаванне: аб сексе так шмат кажуць, што знікла жаданне ім займацца. Вы з гэтым згодны? Могуць лішак і даступнасць інфармацыі зніжаць цікавасць да процілеглага полу?

— Забаронены плод заўсёды салодкі. У савецкі час шматлікія табу актывізавалі і фантазію, і лібіда. Сёння інфармацыі дастаткова, а сексуальная цікавасць, сапраўды, знізілася. Асабліва з боку мужчын. Многія жанчыны на кансультацыях прызнаюцца ў сексуальнай незадаволенасці. І не ў апошнюю чаргу я тлумачу гэта тым, што культура ўзаемаадносін паміж паламі ў нас па-ранейшаму нізкая. Адсутнасць выхавання ў сем'ях і ўстановах адукацыі прыводзіць да таго, што звесткі аб ГЭТЫМ дзеці атрымліваюць з інтэрнэту або ад аднагодкаў. Што ў выніку? Не фарміруецца павагі мужчын да жанчын і наадварот. Знікае таямніца, якая прыцягвае «інь» і «ян». Калі жанчыны становяцца даступнымі, то ўспрымаюцца як «адкрытая сумная кніга», цяга да іх знікаецца.

— То-бок інфармаванне — гэта яшчэ не выхаванне...

— Зразумела. Вопыт многіх краін пераконвае: чым больш узважана, разумна падыходзяць да пытанняў сексуальнага выхавання, чым раней пачынаюць пасвячаць дзяцей ва ўзаемаадносіны палоў, тым менш узнікае праблем з захворваннямі, якія перадаюцца палавым шляхам, раннімі цяжарнасцямі, абортамі і г. д. Хто папярэджаны — той узброены. Пурытанства ў эпоху інтэрнэту ўжо не мае сэнсу. Секс не можа і не павінен успрымацца як «бруд», нешта ганебнае і непрыстойнае. Але трэба ўсталяваць у грамадстве своеасаблівае «сіта», якое будзе адсейваць зярняты ад пустазелля. Выхаванне, культура — і ёсць найлепшае «сіта». На жаль, да гэтага часу многім дарослым цяжка перамагчы стэрэатыпы, якія ў іх склаліся. Пытанні дзяцей яны часта пакідаюць без увагі, адмоўчваюцца. А потым абураюцца: адкуль такая распуста? А вось адтуль — нашчадкі знайшлі адказы на свае пытанні па-за сям'ёй і па-за школай.

— Калі і з чаго трэба пачынаць сексуальнае выхаванне?

— Першы перыяд павышанай цікаўнасці дзіцяці — «Як я з'явіўся на свет?», «Чаму хлопчыкі адрозніваюцца ад дзяўчынак?» — прыпадае на ўзрост 3-5 гадоў. Трэба задавальняць цікавасць дзяцей з улікам іх развіцця і разумення. Распавядаючы пра бусла, які іх прынёс, ці пра тое, што іх знайшлі ў капусце, можна падарваць давер да сябе. Сыны і дочкі, напэўна, пачуюць па-за сценамі дома іншыя, значна бліжэйшыя да праўды жыцця адказы. Мяркую, можна растлумачыць так: «Ты нарадзіўся таму, што мы, твае мама і тата, кахаем адно аднаго і вельмі жадалі, каб у нас з'явіўся такі слаўны чалавечак, як ты, наш працяг». Сёння дастаткова літаратуры аб тым, як адукоўваць малых у гэтых далікатных пытаннях. У маіх знаёмых, медыкаў па прафесіі, палавое выхаванне сына і дачкі адбылося вельмі натуральна і арганічна дзякуючы даступнасці ў хаце медыцынскай літаратуры. Дзеці гарталі «Атлас чалавека», разглядалі, як мы ўладкаваны, задавалі пытанні і атрымлівалі ад бацькоў даступныя адказы.

— З сынам пра гэта павінен гутарыць тата, а з дачкою — мама?

— На мой погляд, так. Калі бацькі ў сям'і няма, можна папрасіць сваяка-мужчыну ці педагога, ці трэнера пагаварыць з хлопчыкам.

— «Акультурыць» кожнага з бацькоў складана. Можа, варта было б усё ж спецыялістам распрацаваць стройную сістэму сексуальнага выхавання і паслядоўна ўкараняць веды, пачынаючы з дзіцячых садоў і да ВНУ?

— Згодная. У некаторых краінах сексуальнай асветай займаюцца сямейныя ўрачы. Але ў нас, мяркую, такімі пытаннямі мусіць заняцца сістэма адукацыі. Калі будуць падрыхтаваны дасведчаныя спецыялісты, гэта — найкарацейшы шлях да вырашэння многіх праблем. На мой погляд, недастаткова не толькі тлумачыць юнакам і дзяўчатам, у якім узросце пераважней пачынаць інтымнае

жыццё, як засцерагацца ад непажаданай цяжарнасці. Выключна важна, паўтару, — выхоўваць павагу паміж поламі, знаёміць не толькі з анатамічнымі, але і з псіхалагічнымі адрозненнямі мужчын і жанчын. Часам я гляджу на маладых дзяўчат у шортах-трусах і ў майках «у абліпку», з залішне глыбокім дэкальтэ і думаю: яны, мусіць, не разумеюць, што самі правакуюць некаторых мужчын на непрыстойныя прапановы і дзеянні.

— Дзеці звяртаюць увагу не толькі на тое, што гавораць бацькі, але перш за ўсё на тое, як яны паводзяць сябе.

— «Рабі, як я» — залатое правіла выхавання. На прыкладзе бацькоў хлопчыкі і дзяўчынкі бачаць мадэль адносін паміж поламі. І калі бацька клапоціцца пра маму, дапамагае ёй, не дазваляе займацца цяжкай працай, праяўляе цеплыню і пяшчоту, можна не сумнявацца, што дзеці засвояць гэтыя ўрокі: ім не прыйдзецца доўга тлумачыць, што значыць быць мужчынам, якой павінна быць жанчына. А калі дачка бачыць, як мама ўвесь час мяняе «спадарожнікаў жыцця», то, чаму б яе ні вучылі, вялікая вераграднасць, што дзяўчынка стане такой жа «вольнай» у адносінах з мужчынамі.

— Пра што важна памятаць мамам і татам, каб фарміраваць у сыноў і дачок здаровую сексуальнасць? Якія памылкі дарослыя часта дапускаюць?

— На жаль, я назіраю дастаткова шмат неадукаванасці ў паводзінах дарослых. У мяне выклікала здзіўленне і абурэнне прызнанне адной з кліентак: 8-гадовага сына яна нярэдка садзіць на калені, цалуе яго ў вусны, а ён кладзе галаву ёй на грудзі. Некаторыя маці могуць зайсці да сына пераходнага ўзросту ў ванны пакой, калі той мыецца. Ведаю прыклады, калі 10-гадовыя хлопчыкі спяць у адной пасцелі з мамай ці калі тата купае дачку такога ж узросту. У многіх сем'ях лічаць нармальным у прысутнасці дзяцей пераапранацца, хадзіць у ніжняй бялізне. Некаторыя бацькі не бачаць у гэтым ніякай праблемы. А праблема ёсць! Гэта так званы псіхалагічны інцэст: ён можа прывесці з цягам часу да рознага роду сексуальных адхіленняў і парушэнняў.

— З якога ўзросту трэба спыняць абдымкі-цалаванкі з дзецьмі?

— Тут нельга ўсталёўваць жорсткія межы. Дзеці розныя, яны адрозніваюцца асабліваснямі саспявання і развіцця. Бацькі павінны адчуваць такія рэчы ў адносінах са сваімі дочкамі і сынамі.

Вольга ПАКЛОНСКАЯ.

Нататкі шматдзетнага таткі

МАЙСТЭРСТВА ТОНКАЙ ДЫПЛАМАТЫІ

* * *

Старэйшая дачка папрасіла купіць ёй для школы ўсялякую дробязь: рабочы сшытак па англійскай, контурную карту па геаграфіі, два блокі для чарчэння і бялілы.

Заехаў па сваіх справах у адну кніжную краму і ўспомніў пра дачку.

Пытаюся ў прадаўшчыцы:

— Скажыце, можа, у вас ёсць рабочы сшытак па англійскай за дзясяты клас?

— На верхняй паліцы паглядзіце.

— О, дзякуй! А контурнай карты па геаграфіі часам няма?

— На стэндзе стаяць.

— Супер! А можа, яшчэ блокі для чарчэння ёсць?

— Унізе, дзе альбомы для маляванння.

— Дзякуй вялікі! І апошняе пытанне: бялілы?

Прадаўшчыца стомленая:

— Малады чалавек, бялілаў, на жаль, няма, у нас тут усё ж кніжная крама.

Так, не пашанцавала...

Хацеў ёй сказаць, што калі я быў маладым чалавекам, у кнігарнях прасцей было купіць бялілы, чым кнігі, але пабаяўся, што яна раззлуецца і адбярэ ў мяне контурную карту.

* * *

З раніцы на сямейнай нарадзе вырашылі наведаць бабулю (маю маму). Прычым так наведаць, каб пры гэтым трапіць на дранікі.

Але паколькі я лічу, што пра візіты да бабулі павінны дамаўляцца ўнукі, то даручыў гэта дзецям.

Двайняткі радасна пабеглі па тэлефон, але я іх спыніў.

Пытаюся:

— І што вы скажаце бабулі?

— Скажам, што прыедзем да яе ў госці.

— Няправільна. Напрошвацца ў госці непрыгожа, вы павінны зрабіць так, каб бабуля сама нас запрасіла.

— А як?

— Ну скажыце, што вы вельмі па ёй засумавалі, што хочаце яе ўбачыць.

— Добра.

Праз пяць хвілін прыбягаюць задаволеныя.

Пытаюся:

— Ну што, дамовіліся?

— Ага. Толькі не на сёння, а на заўтра. І не мы да бабулі едзем у госці, а яна да нас.

Ну што я магу сказаць: выдатна дамовіліся!

Прыйшлося тэрмінова тэлефанаваць маме і тлумачыць «палітыку партыі»: што мы хочам (а) самі прыехаць да яе ў госці, (б) абавязкова сёння і (в) пажадана яшчэ і на дранікі. Мама, зразумела, адразу ж пагадзілася.

Карацей, не атрымалася ў мяне навучыць дзяцей майстэрству тонкай дыпламатыі — мама сама аказалася цудоўным дыпламатам.

* * *

Старэйшая дачка чытае малодшай «Казку пра мёртвую царэўну і сем волатаў». Дайшла да месца, дзе волаты прыйшлі дадому і бачаць, што дома прыбрана, а хто прыбраў — незразумела.

І далей там ёсць такія радкі: «Коль ты старый человек, дядей будешь нам навек, коль старушка — будь нам мать...» і гэтак далей.

І тут старэйшая дачка пытаецца:

— А чаму, калі стары чалавек, то дзядзька, а калі бабулька, то маці? Па ідэі там павінен быць бацька, а не дзядзька.

Шчыра скажу, такія пытанні вельмі не люблю, бо тэкст напісаў Пушкін, а тлумачыць павінен чамусьці я. А я ўяўлення не маю, чаму ён так напісаў: можа, падыходзячую рыфму не знайшоў, можа, проста не падумаў.

Мог жа напісаць і так: «Коль ты старый человек, батей будешь нам навек, коль старушка — будь нам тётей...»

Гэта ж Пушкін — як хацеў, так і напісаў. Але дзецям жа так не скажаш.

Таму прыйшлося сказаць ім, што проста волат не вельмі ўдала выказаўся. Волаты ўвогуле народ просты: што першае ў галаву прыходзіць, тое і кажуць (заадно і класіка быццам бы выгарадзіў).

Але наогул шкада, вядома, што няма магчымасці пацікавіцца непасрэдна ў Пушкіна, чаму ён так напісаў.

P. S. Нечым жа ён павінен быў кіравацца, акрамя жадання паздзекавацца з чытачоў?

* * *

Забраў двайнятак з гуртка па гімнастыцы, паднімаемся ў ліфце. Раптам заўважаю, што ў іх далоні чымсьці размаляваныя.

Пытаюся:

— А што гэта ў вас на далонях намалявана?

Вера, раскрываючы далонь:

— Гэта нам адзнакі па гімнастыцы паставілі. Мне — «дзевяць», а Полі — «восем».

— А што за каракулі побач з адзнакамі?

— Гэта трэнер распісалася, каб ты не падумаў, што мы сабе самі адзнакі намалявалі.

Ну што я магу сказаць? Вельмі арыгінальны спосаб «прастаўлення» адзнак.

Адзіны недахоп — з непрывычкі складана заўважыць. А пасля мыцця рук яны і зусім рызыкуюць знікнуць (асабліва калі адзнакі дрэнныя, а рукі апрацоўваць антысептыкам).

Таму наступны раз прапаную трэнеру па гімнастыцы ставіць адзнакі дзецям проста на лоб — так і лепш відаць, і даўжэй пратрымаюцца.

Тым больш што адзнакі добрыя, няхай усе бачаць.

Павел ХОЛАД.

«Жонка прасіла, каб я нікому не аддаваў дзяцей»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

У мяне не было часу на перажыванні. На маіх руках аказаліся два чалавекі — маленькі і вялікі, якім патрэбны быў пастаянны догляд: пакарміць, памыць, пераапрануць. Света, пасля таго як выпісалася з раддома, баялася нават браць немаўля на рукі, каб не выпусціць. Прычым пакарміць Свету было значна складаней, чым Захарку. Націскаў рукой на грудную клетку і ў такт даваў лыжачку супу, каб яна магла яго праглынуць. Паралельна таму, як Захар падрастаў, мацнеў, сам мог нешта зрабіць, Свеце патрабавалася ўсё больш і больш догляду. Гэтыя паўтара года былі вельмі складаныя для мяне. У самыя цяжкія моманты плячо падстаўлялі мае бацькі.

Калі жонку паклалі ў паліятыўнае аддзяленне, я не раздумваючы лёг туды разам з ёй. Дактары шчыра здзівіліся, думалі, што я яе брат. Света, можа, таму мяне і выбрала, што адчувала за мной нейкую сілу, якой нават я сам не ўсведамляў. Я ж проста рабіў тое, што мусіў, для мяне гэта было само сабой зразумела. Напэўна, нехта б паступіў інакш... Але кожны дзень чалавек робіць выбар, а потым з гэтым выбарам жыве ўсё астатняе жыццё.

Я назіраў і прыйшоў да высновы, што дзяцей больш траўміруе не сама падзея, а рэакцыя на яе дарослых. Менавіта таму я стараюся на ўсё рэагаваць стрымана. Калі Захар маму практычна не памятае, то Цімафею было 6 гадоў, калі яна захварэла. Смерць была не раптоўнай. За паўтара года хваробы мы пражылі ўсе стадыі: ад адмаўлення да прыняцця. Усе, у тым ліку і сама Света, разумелі, да чаго гэта ідзе.

Света перажывала, што Захар не будзе яе памятаць. Але ў нас дома ёсць яе фотаздымкі. На восеньскіх канікулах я ездзіў па рабоце ў Салігорск, адкуль родам жонка, і ўзяў з сабой дзяцей. Мы пагулялі па горадзе, я паказаў ім дом, дзе вырасла іх мама. Часам мне здаецца, як быццам нічога не здарылася. І Света проста з'ехала ў камандзіроўку. Такое своеасаблівае адчуванне яе прысутнасці. Мяне непакоіць, што дзеці не бачаць прыкладу здаровых узаемаадносін паміж мужчынам і жанчынай. Але спецыяльна шукаць вялікае каханне я не хачу.

«ТЭЛЕФОН — САМАЯ ГОРШАЯ «НЯНЬКА»

Сумяшчаць ролі мамы і таты — яшчэ тая задача. Спраўляцца дапамагаюць дзядуля з бабуляй (Ілья з сынамі жывуць разам з яго бацькамі ў прыватным доме ў вёсцы пад Мінскам. — **Аўт.**) ды і самі дзеці. Цімафей увогуле самастойны. І ў хаце прыбрацца можа, і паесці прыгатаваць.

Бяда сучасных дзяцей — што яны непрыстасаваныя да жыцця. Нічога не ўмеюць рабіць рукамі. Мой Захар у тры гады ўжо сам мыў посуд. У чатыры мог прыгатаваць салату, бліны. Замяшае цеста і крычыць: «Тата, запалі мне газ, буду пячы!» І тут пытанне не ў тым, што я яго чамусьці спецыяльна вучыў. Дзеці не ўмеюць не таму, што іх ніхто не навучыў, а таму, што ім ніхто не дазволіў гэта рабіць. У той момант, калі ў малечы быў творчы парыў, яму хацелася штосьці самому зрабіць, яго спынілі. Бо гэта бардак, гара мукі па кухні. Часу і так няма. Трэба бегчы тудысюды. А яшчэ і фотачкі паспець запосціць у «Інстаграм». Бацькі часта забываюцца: каб навучыць, трэба спярша сапсаваць. А я дазваляю псаваць.

Тэлефон у сучасных рэаліях — зручная «нянька», прычым самая горшая, якую толькі можна прыдумаць. Бацькі перакладаюць на яго адказнасць, не разумеючы, да чаго гэта можа прывесці. Бо для таго, каб мозг сфарміраваўся гарманічна і дзіця было развіта духоўна і фізічна, трэба шмат рухацца і мацаць усё рукамі. Тэлефон жа і планшэт зводзяць увесь наш складаны свет да ўзроўню двухмерных мадэляў на экране. Можна перакінуць на гэту «няньку» дзяцей і вырашаць свае справы. Але я такім прыёмам не карыстаюся. Прапаную хлопцам больш вясёлае і карыснае баўленне часу. Калі Цімафею было 5 гадоў, я сабраў для яго невялікі матацыкл. Калі ён ламаецца, рамантуем разам. Ездзім сям'ёй на рыбалку (Цімафей да фанатызму любіць вудзіць рыбу) з начоўкай, ставім палатку, разводзім вогнішча, гатуем на агні.

Больш за ўсё мяне вымотвае шматзадачнасць. Гэта жанчына можа адначасова гатаваць ежу, развешваць бялізну і размаўляць з мамай па тэлефоне. Мужчына ж у стане рабіць штосьці адно. Гэта закладзена эвалюцыйна. Таму часам лаўлю сябе на думцы: дзень прайшоў, здаецца, нічога істотнага не зрабіў, а стаміўся — быццам вагоны разгружаў. Самае складанае ў доглядзе дзяцей для мяне — банальнае мыццё. Дзякуй богу, мы жывём у сучасным свеце, дзе ёсць пральная машына. Але потым жа трэба ўсе тыя дзіцячыя рэчы развесіць, рассартаваць і раскласці па паліцах. А зранку яшчэ падабраць, што надзець... Калі шчыра, у мяне ад гэтага ўскіпае мозг, не разумею, навошта патрэбна столькі адзення.

Месцамі я «мамка» больш мяккая, чым некаторыя жанчыны. Не раз назіраў на дзіцячых пляцоўках, як маці істэрычна рэагуюць, калі дзеці паводзяць сябе не так, як ім хацелася б. Куды ні кінь — пастаянны псіхалагічны гвалт. Не разумею, навошта ладзіць істэрыкі, напрыклад, з-за пралітага на абрус супу. Гэта ж такая дробязь! А дзіця вырасце і любую, нават самую нязначную, няўдачу будзе прымаць блізка да сэрца.

«Часам мне здаецца, як быццам нічога не здарылася. І Света проста з'ехала ў камандзіроўку. Такое своеасаблівае адчуванне яе прысутнасці».

Люблю чытаць, у тым ліку кнігі па выхаванні. Калі пачаў цікавіцца псіхалогіяй, стаў заўважаць дэструктыўныя мадэлі паводзін дарослых. Напрыклад, з савецкіх часоў усіх дзяцей пужалі ўколамі. А пасля здзіўляюцца, што 40-гадовыя мужыкі не ходзяць да ўрача. Як правіла, трапляюць у бальніцу ўжо ў крытычным стане. Бывае, скажаш што-небудзь дзецям, а потым сядзіш і думаеш: «Лепш бы прамаўчаў». Бо ўсё, што ты сказаў ім у дзяцінстве, так ці інакш уплывае на іх будучыню.

«ДАЮ МАГЧЫМАСЦЬ НАБІВАЦЬ ГУЗЫ, ПАКУЛЬ МАЛЫЯ»

Страх пакарання для дзіцяці часта большы за страх смерці. Малеча памятае, як бацькі рэагавалі на нейкую яго правіннасць у мінулым, і не хоча паўтарэння гэтай сітуацыі. Колькі выпадкаў калі падчас пажару, замест таго каб уцячы з хаты і папрасіць дапамогі, дзеці хаваюцца пад ложкам і гінуць. Ведаю гісторыю, калі хлопчык ехаў на веласіпедзе, зваліўся і ўдарыўся жыватом аб руль. Прыйшоў дадому і, нічога не сказаўшы бацькам, лёг спаць. Раніцай прачнуўся — увесь распух ад таго, што пайшло заражэнне. Аказваецца, ад удару ў яго пашкодзіўся кішэчнік. Ён баяўся ва ўсім прызнацца бацькам, бо ведаў, што яму за гэта ўляціць... Месяц таму мой Захар разам з суседскімі дзецьмі будаваў шалаш і напароўся каленам на разбітую бутэльку. Прыбег і кажа: «Тата, я парэзаў нагу, у мяне кроў нават у чаравіку ўжо». Гэта дарагога варта, што ён пабег хутчэй дадому, каб звярнуцца па дапамогу.

Калі бачу, што хлопцы кудысьці лезуць, але іх жыццю і здароўю нічога не пагражае, не ўмешваюся. Даю магчымасць ім памыляцца, набіваць гузы, пакуль малыя. Потым, калі падрастуць, ужо будуць ведаць, што не ва ўсе месцы варта лезці. Захар, калі яму было чатыры гады, захацеў навучыцца абіраць бульбу. Я не забараняў, хоць разумеў, што ён можа парэзаць палец. І гэта здаралася. І не раз. Затое цяпер ён ведае, што сам нясе адказнасць за наступствы сваіх дзеянняў.

«Напэўна, нехта б паступіў інакш... Але кожны дзень чалавек робіць выбар, а потым з гэтым выбарам жыве ўсё астатняе жыццё».

Ілья не ўмешваецца, калі бачыць, што яго сыны кудысьці лезуць, але іх жыццю нічога не пагражае.

Падлеткі часта атрымліваюць траўмы менавіта з-за гіперапекі бацькоў. Туды не лезь, тое не чапай. З аднаго боку, бацькі аберагаюць сваіх дзяцей. З іншага — не даюць магчымасці атрымаць бясцэнны досвед, навучыцца ўсведамляць небяспеку і правільна ацэньваць сітуацыю. Цімафей з пяці гадоў катаецца на матацыкле. І сёння яго не прымусіш прамчацца на максімальнай хуткасці, таму што ён дакладна ведае: падаць вельмі балюча. Калі дзеці не атрымліваюць досвед узаемадзеяння з небяспекай і ў іх няма страху ні перад падзеннем, ні перад хуткасцю, то ў падлетквым узросце пачынаюцца непрыемныя гісторыі. Яны лезуць на дахі закінутых будынкаў, ганяюць без тармазоў, не разумеючы, якія могуць быць наступствы. Траўму ж дзіця можа атрымаць і на роўным месцы. Па лесвіцы спускаешся — ужо небяспечна: калі неадэкватна будзеш паводзіць сябе — можаш зваліцца.

Важна навучыць дзяцей браць на сябе адказнасць за свае ўчынкі. Быў момант, калі Цімафей, замест таго каб рабіць дамашняе заданне, катаўся на веласіпедзе. А потым спрабаваў перакласці на мяне адказнасць за сваю «двойку»: маўляў, гэта ты вінаваты, бо не прымусіў мяне зрабіць урокі! Кажу: гэта толькі твая адказнасць, я ўжо сваё адвучыўся. Патрэбна дапамога — спытай, а стаяць над табой і прымушаць не збіраюся! Мне важна, каб ён сам, без прымусу, хацеў штосьці даведацца, чамусьці навучыцца. Адзнакі ж — справа другарадная. Пасля той размовы пытанне з урокамі знялося. Цяпер ён сам шукае баланс паміж выкананнем дамашніх заданняў і адпачынкам. І паказвае прыклад малодшаму брату.

Стараюся выхоўваць сыноў так, каб яны не страцілі сувязь з сабой. Каб чулі сябе, свае жаданні. Каб не было такога, што да 30 гадоў перагарэлі і не разумеюць, што хочуць ад жыцця. Не задаваліся пытаннямі: «Навошта вучыліся ў інстытуце, дзе было нецікава, а цяпер працуем на рабоце, якая нам не падабаецца?» Важна даваць магчымасць выбару, спрабаваць штосьці новае, памыляцца. І не заглушаць іх сапраўдныя жаданні сваімі неапраўданымі чаканнямі.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота Лізаветы ГОЛАД.
Больш фота на сайце zviazda.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (Организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Мозырский ДОК» (Продавец) извещает о проведении 12 января 2023 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: Победитель аукционных торгов дополнительно возмещает расходы по предпродажной подготовке – по определению рыночной стоимости в сумме **324,00** бел. руб.		
1	**Капитальное строение с инв. № 331/С-45500**, общей площадью **241,3 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **контора**. Адрес: Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. 9 Мая, 58. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321450100004001278** общей площадью **0,2072 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. 9 Мая, 58. **Целевое назначение земельного участка:** для размещения объектов административного назначения	**48 360,00**	4 836,00

Продавец: ОАО «Мозырский ДОК», 247760, г. Мозырь, ул. Социалистическая, 120а.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляется по контактному тел.: **8 (044) 757-56-50 директор филиала Звертовский Сергей Григорьевич. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (ОАО «Мозырский ДОК»):** р/с BY72 AKBB 3012 0142 7309 3330 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 317, УНП 490617960, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 8 декабря 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 10 января 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты: 50 % цены продажи объекта в течение 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи; остальные 50 % цены продажи объекта в течение 30 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

